© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

# Хрыстос уваскрос! Сапраўды ўваскрос!!


ПАГОНЯ

Чацвер
27 красавіка 2000 г.
№ 14 (461)
Кошт 70 рублёў


## «Рэпарцёр» з пятлёй на шыі»

**Гарадзенскія ўлады адмаўляюць у рэгістрацыі гарадской газеце «Рэпарцёр». Новую газету спрабуюць зарэгістраваць вядомыя ў Гродне журналісты Анджэй Пісальнік, Ірына Чарняўка, Аксана Сівадзедава, Аляксандр Дварэцкаў ды іншыя.**

Першы раз выканкам абгрунтаваў сваю адмову тым, што яму невядома аб праве ўласніка распараджацца памяшканнем, дзе размясцілася рэдакцыя. Сярод прычын другой адмовы была спасылка на тое, што дакументы аб узгадненні адрасу выдаюцца толькі юрыдычным асобам, а не грамадзянам. За трэцяй спробай узгадніць адрас размяшчэння газеты ўважліва сачыў шэраг беларускіх і міжнародных грамадскіх арганізацый.

Напярэдадні прыняцця ўладамі рашэння расейскі Фонд абароны галоснасці, Беларуская асацыяцыя журналістаў і Беларускі ПЕН-цэнтр накіравалі ў Гарадзенскі гарвыканкам свае пратэсты. Акрамя таго, запыты наконт рэгістрацыі газеты «Рэпарцёр» гарвыканкам атрымаў ад газеты «Свободные новости» і польскай «Газеты выборчай». Аднак усё гэта не паўплывала на рашэнне ўладаў: выканкам за подпісам старшыні Анатоля Пашкевіча зноў адмовіў у рэгістрацыі, прычым, гэтым разам без усялякага тлумачэння.

Супрацоўнікі яшчэ не існуючай, але ўжо апальнай газеты ўспрымаюць дзеянні гарвыканкама як чыноўніцкае самавольства, якое, па сутнасці, пазбаўляе іх права на прафесію. Журналісты збіраюцца рашуча абараняць свае права на стварэнне газеты «Рэпарцёр». Акрамя звароту ў суд, яны маюць намер правесці акцыю пратэсту пад лозунгам «Рэпарцёр» з пятлёй на шыі».

**Наталля Кулагіна**

## Чысты чацьвер сустрэнем чыстымі?

**З 24 па 28 красавіка ў большай частцы нашага гораду адключана гарачая вада. Як паведамілі супрацоўнікі Гарадзенскага вадаканала, гэта зьвязана з «выпрабаваньнем цеплавых сетак на цеплавыя страты». Такога кшталту выпрабаваньні праводзяцца раз у пяць гадоў.**

Пашчасьціла толькі жыхарам вуліцаў Урублеўскага, Дамброўскага, мікрараёнаў Вішнявец, Азот і Прынёманскі - у іх гарачая вада ёсць. Астатнім гарадзенцам у «чысты чацьвер» давядзецца грэць ваду ў тазіках ці штурмаваць лазьні на вуліцах Болдзіна і Цітова.

**Юлія Дарашкевіч**

## «Мін» больш не будзе

**У Гродне на буйныя сумы аштрафаваны «тэлефонныя тэрарысты».**

У лістападзе 1999 года ў дачыненні да двух 24-гадовых гарадзенцаў Яўгена Будзілы і Анджэя Стэфановіча была распачата крымінальная справа па артыкуле 201 (хуліганства) КК Беларусі. Яны абвінавачваліся ў тым, што вырашылі «пажартаваць» і на працягу адной ночы патэлефанавалі на кансервавы завод, што ў вёсцы Калбасіно Гарадзенскага раёна, а таксама на размешчанае ў Гродне сумеснае прадпрыемства «Дынама-програм» і паведамілі пра «замініраванне» прадпрыемстваў.

Суд Кастрычніцкага раёна Гродна прыняў рашэнне аштрафаваць «тэлефонных тэрарыстаў» у памеры 400 мінімальных зарплат кожнага, а таксама абавязаў іх пакрыць учыненую прадпрыемствам шкоду і аплаціць расходы спецыяльных службаў, якія прыбылі для «размінавання» аб'ектаў.

**Ася Куніцкая**



### НАДВОР'Е

**28 красавіка** - воблачна, з праясненнямі, вецер няўстойлівы. Тэмпература паветра - уначы +8...+10, удзень +19...+24. **29 красавіка** - воблачна, з праясненнямі, магчыма - навальніца. Тэмпература паветра - уначы +7...+9, удзень +18...+25.

## Велікоднае пасланне Мітрапаліта Менскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

*«Уваскрасення дзень, прасвятлімся людзі: Пасха, Господняя Пасха»!*

**Ірмос Пасхі**



Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі, манахіні і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

**Хрыстос уваскрос!**

Узнімемся духам, браты і сёстры: «Сёння збаўленне свету, свету бачнаму і нябачнаму! Хрытос з мёртвых - паўстаньце з Ім і вы; Хрыстос у славе Сваёй, - узыходзьце і вы; Хрыстос з гроба, - вызваляйцеся ад путаў граху; адчыняюцца вароты пекла, знішчаецца смерць, адыходзіць стары Адам, здзяйсняецца новы: ...абнаўляйцеся!» Так усклікаў усяленскі вучыцель і святіцель Грыгорый Багаслоў, так абвесцім і мы: Пасха! Гасподняя Пасха!

Гэта - найвышэйшае, самае радаснае і самае старажытнае хрысціянскае свята. У крыжовай смерці і ўваскрасенні Госпада нашага з мёртвых заключаецца аснова і сам сэнс усяго Хрысціянства.

Пасха - азначае збаўленне, пераход. Яўрэі, святкуючы старазапаветную Пасху, узгадваюць пра вызваленне сваіх продкаў з егіпецкага палону і рабства. А хрысціяне, адзначаючы Пасху новазапаветную, святкуюць вызваленне з рабства д'ябла, збаўленне ад граху і смерці, якое прыйшло да нас праз Госпада нашага Іісуса Хрыста.

У Праваслаўнай Царкве шмат вякоў існуе канон пасхальнай іконы Збавіцеля - «Сашэсце ў пекла». Не толькі ў пекла сыходзіў Хрыстос, каб збавіць тое, што загінула. Увесь час Ён спускаецца ў пекла сучаснага жыцця, пекла многіх абставінаў, і ахінае сілаю Сваёй любові сэрцы тых, хто ў адчаі...

...У Хрысце мы атрымліваем свабоду ад граху і ад рабства д'ябла. Таму сёння мы перажываем гэтую падзею таксама яўна, як яе перажылі вучні Госпада, святыя Апосталы.

Абвяшчэннем гэтай радасці і перамогі яны пачалі сваю сусветную пропаведзь, на факце Уваскрасення Хрыстовага заснавалі яны ўсе ісціны нашае веры, усе нашы найвышэйшыя спадзяванні.

Таксама, як і Апосталы, мы павінны несці гэтую радасць, гэтую добрую вестку аб прыходзе збаўлення ўсім людзям, бо сказана: «Вы - род абраны, царственнае свяшчэнства, народ святы, людзі прыдбаныя, каб абвяшчаць дасканаласць Таго, Хто паклікаў вас...» (1 Пят. 2:9).

Не заўсёды з мірам сустракалі і сустракаюць Хрыстовых вестуноў. Але вернасць Госпаду свайму трэба захоўваць да апошняга дыхання. Уваскрашае Гасподзь сэрцы праведных, уваскрасіць Ён пасля смерці і «душы забітых за слова Божае» (Адкр. 6:9). Правідэнцыяльна, што напярэдадні трэцяга тысячагоддзя ад Раства Хрытовага Беларуская Правалаўная Царква далучыла да ліку святых 23-х навамучанікаў, клірыкаў Менскай епархіі. Гэтыя людзі блізкія нам па часе, яны - нашыя сучаснікі, супрацоўнікі, браты ў Хрысце. «І дадзена было кожнаму з іх адзенне белае...» (Адкр. 6:11).

Спадобі і нас, Госпадзі, дастойна славіць усесвятое Уваскрасенне Тваё! З малітвай пра гэта мы звяртаемся да Маці Божае - Заступніцы роду хрысціянскага, Пуцяводнай Зоркі, Якая вядзе нас да нашага збаўлення ад граху.

Знамянальна, што сёлета, у жніўні, праваслаўны народ Беларусі будзе адзначаць вялікую падзею, звязаную з Прачыстаю Маці Госпада нашага Іісуса Хрыста. 500 гадоў таму па водах Свіслачы з Кіева ў Менск прыплыла цудатворная ікона Божае Маці, якая з таго часу ахоўвае нашу святую зямлю і называецца Менскай. У дні «сумятні народаў і безвыходнасці» (Лк. 21:25) сярод смуты і ўсеагульнага адзічэння, Яе светлае аблічча нясе людзям радасць і суцяшэнне.

Калі ж мы задумаемся пра тое, што хацелі б у гэтае светлае свята атрымаць самі і пажадаць іншым, то ўзгадаем запавет Хрыстовы: «Любіце адзін аднаго...Па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў паміж сабою» (Ін. 13:34, 35). Святая Царква Хрыстова, паза якой мы не павінны шукаць збаўлення, як дзеталюбівая маці клапоціцца пра атрыманне намі благадаці Божае, пра захаванне намі святаайцоўскай спадчыны. Цяпер, як і ў даўнія часы, паўстаюць супраць яе сілы зла, каб разбурыць не толькі яе, але і ўсю нашу зямлю, разбэсціць людзей грахамі і бязладдзем. Але цвёрдым застаецца слова Госпада, Які сказаў: «Я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не адолеюць яе» (Мф. 16:18).

У нашым чаканні Уваскрасення мёртвых і жыцця будучага веку, мы з вамі, дарагія мае, ужо цяпер, у гэтыя Велікодныя дні, перажываем светлую раніцу восьмага дня тварэння, калі Гасподзь створыць «новае неба і новую зямлю;.. І абатрэ Бог усякую слязу...і смерці ўжо не будзе» (Адкр. 21:1, 4). Бо калі уваскрос Хрыстос, то і наша надзея, наша вера не дарэмныя!

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры і ўся богалюбівая наша паства! У гэтыя збавіцельныя дні мы вітаем са Святой Пасхай усіх, хто носіць імя хрысціяніна і жадаем ім уладкаваць сваё жыццё ў міры і аднадумстве. Словамі свяціцеля Іаана Златавустага заклікаем усіх узрадавацца з намі: «Багатыя і ўбогія, адзін з адным лікуйце. Устрыманыя і лянівыя, дзень гэты ўшануйце. Тыя, што пасцілі і што не пасцілі, узвесяліцеся сёння...». У Велікоднай радасці ўзнясем падзяку нашаму Тварцу, «Які даў нам перамогу Госпадам нашым Іісусам Хрыстом» (1 Кар. 15:57).

**Хрыстос уваскрос! Сапраўды ўваскрос!**

## Ленін у Гародні

**22 красавіка ў Гародні прайшлі дзьве акцыі-пэрформансы, прысьвечаныя 130-й гадавіне зь дня нараджэньня правадыра бальшавікоў Уладзіміра Ульянава-Леніна.**

Першую з гэтых акцыяў ладзіў Гарадзенскі Малады Фронт, які вырашыў пасьмяяцца зь вядомых камуністычных сымбаляў. На плошчы Леніна а палове другой дня, каля помніка «правадыру» была пастаўлена стылізаваная «скульптура» «Рабочы і сялянка», але ў гэтым выпадку ролю рабочага выконвала дзяўчына, апранутая ў рабочы строй, а сялянкай быў хлопец у спаднічцы, з падфарбаваным тварам.

Апроч гэтага «рабочы і сялянка» трымалі піянерскі сцяг з выявай Ільіча і парожнюю бутэльку з-пад піва, якая сымбалізавала сабою мару пралетарыята. Прастаяўшы 25 хвілін, «рабочы і сялянка» рушылі праз цэнтр гораду ў бок плошчы Савецкай.

Аднак дайсці да плошчы ім не ўдалося. Каля ўнівермагу тры ўдзельнікі акцыі былі затрыманыя міліцэйскім нарадам Ленінскага РАУС на чале са старшынёй Мышкіным. Прычыну затрыманьня карэспандэнту ПАГОНІ старшына патлумачыў «зьдзяйсьненьнем супрацьпраўных дзеяньняў». Як стала вядома пазьней, нехта патэлефанаваў у міліцыю й сказаў, што моладзь закідвае камянямі помнік Леніна.

У райадзьдзеле ўдзельнікаў кампазіцыі пратрымалі каля паўгадзіны. Пратакол не складалі, спраўдзілі толькі пашпартныя дадзеныя. Міліцыянтаў вельмі цікавіла, ці не стаяць «рабочы і сялянка» на ўліку ў «псіхушцы». А напаследак папярэдзілі: «не хадзіце больш так, а то сустрэнуць вас БПСМаўцы ды паб'юць, і міліцыя не здолее дапамагчы».

Каля 14.30 пачаўся пэрфоманс, які ладзілі гарадзенскія анархісты. Арганізаваным тлумам яны вырашылі падтрымаць ідэю дзяржаўнага суботніка. У лепшай традыцыі 20-х гадоў яны прыцягнулі бервяно, якое ўрачыста цягалі па горадзе. Там таксама былі і лёзунгі: «Даёшь - Давай!», «Тифозная вошь - враг пролетариата!». Наперадзе калоны ішоў «Ленін». Гэтая акцыя прайшла без затрыманьняў.

**Андрэй Мялешка**

## Прэзентавалі «Фрагмэнты»

**У мінулую суботу ў Гродне адбылася прэзентацыя беларускага філасофскага часопісу «Фрагмэнты». Ладзіла прэзентацыю Даследчая Лабараторыя пры Гарадзенскім універсітэце. Сярод гасцей былі галоўны рэдактар часопіса Ігар Бабкоў, філосаф-літаратар Валянцін Акудовіч.**

Ідэя стварэння «Фрагмэнтаў» паўстала ў 1994 годзе. На сённяшні дзень выйшла ўжо сем выпускаў часопіса. Паводле словаў Ігара Бабкова, давялося прайсці вельмі цяжкі шлях. Многім трэба было даводзіць пра магчымасць беларускага мыслення, філасофіі пабеларуску. Асноўная ідэя, крэда «Фрагмэнтаў» ёсць сярэднееўрапейскі кантэкст для беларускамоўнай сітуацыі.

«Фрагменты», як адзначыў Ігар Бабкоў, - гэта абсалютна адкрытая пляцоўка для дыялогу. Сёння нам трэба навучыцца крытыкаваць.

У 1998 годзе пры «Фрагмэнтах» была распачата серыя «Бібліятэка Фрагмэнтаў», дзе прапагандуецца беларускае культурнае, гістарычнае, паліталагічнае мысленне. Ужо выйшлі творы Алеся Разанава, Сяргея Дубаўца, Юрася Барысевіча, Міхася Баярына, Леаніда Галубовіча ды іншых.

У серыі «Сярэдняя Эўропа» ў 2000 годзе выйшаў беларускі пераклад кнігі Чэслава Мілаша «Скуты розум», дзе ёсць прадмова да беларускага чытача.

**Павал Мажэйка**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# Чарнобыль...

**Мінула 14 гадоў. Гэта была самая страшэнная экалагічная катастрофа. Тысячы людзей ужо памерлі, сотні тысяч хварэюць. Асабліва пакутуюць дзеці - самае дарагое, што у нас ёсць.**

**За гэты час урадам не зроблена ніякіх захадаў, каб пераадолець наступствы катастрофы. Ніхто з былой партнаменклатуры не пакараны за замоўчванне гэтага злачынства. Больш таго, усе яны зноў кіруюць намі, займаючы дзяржаўныя пасады. Па загаду прэзідэнта чыняцца перашкоды фонду «Дзецям Чарнобыля», які штогод вывозіў на аздараўленне за мяжу сотні тысяч беларускіх дзетак. Не прад'яўлены грашовы спазыск нашчадку камуністычнага рэжыму - ураду Расеі. Па міжнароднаму праву яны павінны выплаціць нам 10 мільярдаў даляраў на ліквідацыю наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. А Лукашэнка зноў жадае асвойваць забруджаныя землі рукамі беларускай моладзі, уздымаючы сельскую гаспадарку пакінутай радыеактыўнай тэрыторыі...**

Праз 14 гадоў пасля Чарнобыльскай катастрофы на заражаных тэрыторыях пражывае амаль два мільёны чалавек, у тым ліку каля 500 тысяч дзяцей. Вядома, што Беларусь больш за іншыя краіны пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС: бо на яе тэрыторыю выпала каля 70 працэнтаў усіх радыеактыўных рэчываў, выкінутых з разбуранага рэактара. Пры гэтым, 23 працэнты тэрыторыі аказалася забруджана цэзіем-137 на ўзроўні звыш 37 кілаБэкерэляў на квадратны метр. Для параўнання: на Украіне зона з такім жа (звыш 37 кБк/кв.м) узроўнем забруджвання займае пяць працэнтаў тэрыторыі, у Расеі - 0,6 працэнта. Забруджванне тэрыторыі Беларусі стронцыем-90 звыш 5,5 кБк/кв.м выяўлена на 10 працэнтах плошчы.

Цэзіем-137 на ўзроўні звыш 37 кБк/кв.м пашкоджаны 1,6 мільёна гектараў сельскагаспадарчых палеткаў, у тым ліку 260 тысяч гектараў цалкам выключаны з сельскагаспадарчай вытворчасці. Радыенуклідамі пашкоджана болей за 1685 тысяч гектараў беларускіх лясоў.

Пасля аварыйнага выкіду значная частка радыенуклідаў акумулявалася ў верхнім пласце глебы, і зараз глеба Беларусі ўяўляе сабою галоўную крыніцу паступлення радыенуклідаў у сельгаспрадукцыю. Паводле дадзеных мясцовых грамадскіх цэнтраў радыяцыйнага кантролю прадуктаў харчавання, за 1991-1999 гады ў Чарнобыльскай зоне 20-30 працэнтаў малака змяшчала цэзій-137 вышэй за дапушчальны ўзровень.

Абследаванні ў 1996-1999 гадах дзяцей у вёсках заражаных раёнаў, выявілі высокае ўтрыманне ў іх цэзія-137 - каля 200-400 Бк на кілаграм вагі, у надзвычай неблаганадзейных сем'ях - 1500-2000 Бк/кг, а ў вёсках Кіраў і Хільчыха Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці - нават 4000-7000 Бк/кг. Даследаванні прафесара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта Юрыя Бандажэўскага і яго супрацоўнікаў паказалі, што высокія ўзроўні назапашвання радыецэзія з'яўляюцца прычынай рэзкага пагаршэння здароўя, а назапашванне цэзія-137 звыш 50 Бк/кг вагі цела абумоўлівае паталагічныя змены ў сардэчна-сасудзістай, нервовай, эндакрыннай, імуннай, рэпрадуктыўнай, стрававальнай і мочавыдзяляльнай сістэмах. Пры гэтым, пры аднолькавым з дарослымі харчаванні дзеці атрымліваюць у 3-5 разоў большыя дозавыя нагрузкі, чым дарослыя, - з-за меншай вагі цела і большай інтэнсіўнасці абменных працэсаў. Вясковыя ж дзеці маюць дозавыя нагрузкі ў 5-6 разоў большыя, чым іх гарадскія равеснікі.

Эканамічныя страты ад аварыі на ЧАЭС за 30 гадоў (1986-2015 гг.) складуць 235 мільярдаў даляраў, г.зн. прыкладна 32 дзяржаўныя бюджэты Беларусі, калі браць велічыню бюджэту ў параўнальна благанадзейным 1990 годзе. Апошнім часам Беларусь вымушана штогод траціць 25 працэнтаў дзяржбюджэту на праграму па пераадоленню наступстваў Чарнобыля. Адпаведна ацэнкам спецыялістаў, гэта складае толькі 10 працэнтаў таго, што неабходна для паўнавартаснай мінімізацыі наступстваў. З-за адсутнасці міжнароднага заканадаўства краіна не атрымала кампенсацыі за панесеныя страты ні ад Украіны, ні ад Расеі. Гуманітарная дапамога ў аздараўленні дзяцей аказваецца толькі па лініі міжнародных дабрачынных і грамадскіх арганізацыяў.

Гэта азначае, што неабходна праводзіць сістэмную работу з насельніцтвам па мерах радыяцыйнай абароны. Апошнім часам замест аб'ектыўнага інфармавання насельніцтва пра тую ступень небяспекі для здароўя, што існуе пры высокім заражэнні цэзіем-137 прадуктаў харчавання, замест давядзення да міжнароднай супольнасці інфармацыі наконт маштабаў захворванняў жыхароў Чарнобыльскіх рэгіёнаў - прапаведуюцца бяспека пражывання, вяртанне на адселеныя землі. У такой сітуацыі дапамагло б толькі прадастаўленне фактычных дадзеных пра заражанасць прадуктаў харчавання і саміх жыхароў радыенуклідамі, а таксама інфармацыі пра даступныя меры радыяцыйнай абароны.

Павялічвае праблему абароны насельніцтва ад радыяцыйна-забруджаных прадуктаў харчавання рэзкае зніжэнне матэрыяльнага ўзроўню жыцця людзей, што вымушае іх эканоміць на «чыстых» прадуктах, максімальна пераходзіць на мясцовыя прадукты, на замкнутую сістэму гаспадарання, вырабляць на сваім падворку прадукты не толькі для сябе, але і на продаж гараджанам. У выніку шмат прадуктаў не праходзіць радыяцыйнага кантролю, і радыенукліды з прадуктаў харчавання нейкі час назапашваюцца ў арганізме жыхароў, як забруджаных тэрыторыяў, так і ўсёй рэспублікі.

Найбольш уразлівая частка апраменянага насельніцтва - дзеці і падлеткі. Вынікам хранічнага апраменьвання з'яўляецца падвышэнне долі спадчынных парокаў развіцця дзяцей, маці якіх не прайшлі спецыяльнага медычнага кантролю. Падвышаецца распаўсюджанасць цукровага дыябету, хранічных захворванняў страўнікава-кішэчнага тракту, дыхальных шляхоў, імуназалежных і алергічных хваробаў, а таксама рака шчытападобнай залозы і злаякасных захворванняў крыві. Расце захворваемасць дзяцей і падлеткаў на сухоты. Пры гэтым найбольшая дынаміка захворвання адзначаецца менавіта ў Гомельскай вобласці, што пацвярджае ролю радыяцыйнага фактару ў зніжэнні клетачнага імунітэту і, адпаведна, у пагаршэнні ўстойлівасці імуннай сістэмы да туберкулёзных ды іншых інфекцыяў.

Праблема ўзмацняецца адсутнасцю ў большасці насельніцтва заражаных тэрыторыяў псіхалагічнай настроенасці на мажлівасць абароны свайго здароўя і здароўя сваіх дзяцей шляхам пашырэння ведаў, на рэгулярны кантроль за ўзроўнем назапашвання радыенуклідаў, правядзенне рэгулярнага ачышчэння арганізму ад радыенуклідаў і цяжкіх металаў прыроднымі энтэрасарбентамі, навучанне рацыянальнаму вядзенню гаспадаркі на ўласным падворку, авалоданне навыкамі ачышчэння мясцовых прадуктаў харчавання і выкарыстанне прагрэсіўнага рацыёну харчавання.

Другая вызначальная крыніца забруджвання арганізму жыхароў Беларусі - свінец, які трапляе ў навакольнае асяроддзе ад транспарту. Для жыхароў Беларусі гэта яшчэ і свінец, які ў колькасці некалькіх тысяч тон выкідваўся з верталётаў у палаючы рэактар, а потым - у атмасферу. Даследаванні Навукова-даследчага інстытута радыяцыйнай медыцыны паказалі, што ўтрыманне свінца ў крыві дзяцей значна перавышае дапушчальную канцэнтрацыю (0,1 мг/л) ва ўсіх абласцях рэспублікі. Самае страшнае ўздзеянне свінец аказвае на дзяцей. Ён уплывае на нервовую сістэму, зніжае ўзровень інтэлекту, выклікае змены фізічнай актыўнасці, каардынацыі, слуху. Адбываюцца парушэнні ў абмене гемаглабіну, атрафіруецца слізістая абалонка страўнікава-кішэчнага тракту (апошняе можна трактаваць як заўчаснае «старэнне» дзіцячага арганізму).

Найбольш уражальным прыкладам абароны здароўя дзяцей ад свінца з'яўляецца нацыянальная праграма ЗША 1983-1998 гадоў. За гэты час было абследавана 80 мільёнаў дзяцей і падлеткаў, з якіх 17 мільёнаў мелі перавышэнне нормы 1,1 мг/л. Устаноўлена, што 60 працэнтаў свінца патрапіла ў крыву дзяцей з-за выкарыстання аўтатранспартам этыліраванага бензіну, 20-30 працэнтаў - з-за выкарыстання лакафарбавай прамысловасцю пігментаў на аснове свінца. Поўная забарона на выпуск бензіну з дамешкамі тэтраэтылсвінца і фарбаў са свінцовымі пігментамі дазволіла на пачатак 1997 года знізіць да 1 мільёна (у 17 разоў) колькасць дзяцей, у якіх утрыманне свінца ў крыві было вышэй за норму. У тым жа годзе гэтая норма была зніжана да 0,05 мг на літр крыві.

На працягу 14 гадоў насельніцтва Беларусі падпадае пад камбінаванае ўздзеянне радыяцыі і хімічных фактараў (свінца). Гэта робіць надзвычай актуальнай канцэпцыю рацыёну харчавання жыхароў з выкарыстаннем энтэрасарбентаў, перш за ўсё натуральных біяактыўных кампанентаў. Здольнасцю ачышчаць арганізм як ад радыенуклідаў, так і ад цяжкіх металаў валодаюць некаторыя прадукты харчавання, у прыватнасці, пекціны. Яны могуць выкарыстоўвацца разам з іншымі біяактыўнымі кампанентамі, якія ўваходзяць у рацыён харчавання чалавека. У НДІ радыяцыйнай медыцыны распрацаваная схема прыёму пекцінавых прэпаратаў: для дарослых - 1-2 чайныя лыжкі 2-3 разы ў дзень на 1 шклянку вады, чаю, кампоту ці соку, для дзяцей - па 1 чайнай лыжцы 2 разы ў дзень. Такія курсы мяркуецца праводзіць на працягу трох тыдняў двойчы ў год, у надзвычай неблаганадзейных раёнах - тройчы ў год.

**Уладзімір Траццякоў**




**Аргкамітэт па правядзеньні Усебеларускага Зьезду 16 красавіка правёў, нягледзячы на складанасьці, сваё паседжаньне, на якім былі вызначаныя дэталі арганізацыі мерапрыемства.**

**Зьезд пройдзе ў дзьве сэсіі. Першая прызначаная на 17 чэрвеня, другая - на пачатак восені. Існуюць розныя меркаваньні наконт часу правядзеньня першай сэсіі. З аднаго боку, арганізатары рызыкуюць не пасьпець правесьці належную падрыхтоўку, а з другога - трэба апярэдзіць афіцыйныя зьезды саветаў і выбары ў саюзны парлямант. У выпадку зрыву Зьезда беларускімі ўладамі мяркуецца правесьці яго ў Вільні ці Беластоку.**

* * *

Беларусы замежжа актыўна падтрымліваюць ідэю правядзення Усебеларускага З'езда. Аргкамітэт атрымаў зварот ад Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы і яе намесніка Сяргея Навумчыка. У прыватнасці, яны падкрэслілі: «Рада БНР пацвярджае сваё імкненне да кантактаў з усімі палітычнымі і грамадскімі сіламі Беларусі, якія стаяць на пазіцыях Акта 25 сакавіка 1918 года. Гэта значыць, найперш - Незалежнасці Беларусі». Як гаворыцца ў звароце, шчырую зацікаўленасць у поспеху гэтага форуму выяўляюць і іншыя сябры Рады як у Еўрапейскіх краінах, так і ў ЗША і Канадзе.

19 красавіка Аргкамітэт З'езда атрымаў ліст ад намесніка старшыні Міжрэгіянальнага аб'яднання беларусаў Расеі Валянціна Грыцкевіча. Валянцін Грыцкевіч цалкам ухваляе ідэю правядзення гэтага мерапрыемства і заяўляе пра жаданне прыняць удзел у ягонай працы.

Кантактны тэлефон Сакратарыята Усебеларускага З'езда 223-65-29.

# Дзень перамогі Краю

**У аўторак гарадзенцы ўсклалі кветкі туды, дзе летась пралілася кроў беларускіх нацыяналістаў.**



Роўна год таму актывісты спартова-патрыятычнае арганізацыі «Край» прайшлі па цэнтральнай вуліцы Гародні, ад помніка Вітаўту Вялікаму на Замкавай гары да плошчы Леніна. Хлопцы былі апранутыя ў камуфляж, у руках трымалі запаленыя паходні. На працягу ўсяго шляху адбывалася жорсткая бойка з АМАПам. Але краёўцаў не маглі спыніць нават сьлёзацёкавым газам. І толькі пасьля таго, як міліцыянты накіравалі на краёўцаў машыны, калону героўпатрыётаў удалося спыніць. Яшчэ некалькі дзён пасьля гэтага на бруку насупраць аблвыканкаму былі бачныя вялізныя плямы крыві...

Можа быць, менавіта гэтая кроў і стала прычынай зрыву парляманцкага сходу Саюзу Беларусі і Расеі, які планаваўся ўладай правесьці некалькімі днямі пазьней у Гародні.

Падзеі 25 сакавіка 1999 году ў нашым горадзе ўжо даўно сталі легендай. Відавочцы кажуць, што калі хлопцы ступілі на цэнтральную вуліцу, раптоўна скончыўся дождж і зазванілі званы. Яшчэ распавядаюць, як маладая жанчына кінула каляску з дзіцём і стала прыкрываць сваім целам краёўцаў ад дубінак АМАПаўцаў. Непасрэдная ўдзельніца таго шэсьця расказвала, як яе выратавалі гарадзенкі. Яна атрымала моцны ўдар па галаве і часова страціла зрок. Яе падабралі незнаёмыя дзяўчаты, завялі да сябе ў дом, перапранулі і далі грошай на квіток дахаты...

У гэтым годзе на месца самай жорсткай бойкі леглі кветкі. Паклалі іх адмыслова - чырвоныя паміж белымі. На дрэве побач зьвіўся бел-чырвона-белы з чорнымі стужкамі сьцяжок.

А перад гэтым актывісты БСДГ, БНФ, Маладога Фронту ды іншых моладзевых арганізацыяў наладзілі сымбалічнае шэсьце. Той жа маршрут, той жа час, такая ж колькасьць людзей - каля сарака. Па дарозе славуты беларускі бард Андрэй Мельнікаў, які быў сьведкам леташніх падзеяў, распавядаў падрабязнасьці тае акцыі. «Яны ведалі, на што ідуць, - казаў ён пра краёўцаў. - Гэта была сьвядомая ахвяра».

Затым гарадзенцы наведалі яшчэ адно месца традыцыйнага ўшанаваньня - шыльду паўстанцам 1863-1864 гадоў. І ў тым вечар нікога не зьдзівіла зьяўленьне на сьцяне побач з шыльдай краёўскае ўлёткі: «Твая Радзіма - Беларусь! Любі яе перадусім і больш справай, чым на словах».

**Алеся Тарашкевіч**

# Мілінкевіч сустрэўся з Бжэзінскім

21 красавіка ў Менску адбылася сустрэча старшыні Гарадзенскага абласнога грамадскага аб'яднання «Ратуша» Аляксандра Мілінкевіча з сябрам праўлення Камісіі па міжнародных справах Сената ЗША Янам Бжэзінскім і прэс-аташэ гэтай Камісіі Маркам Тысенам. Падчас спаткання былі абмеркаваныя пытанні абароны праваў чалавека, сучаснай грамадскай і палітычнай сітуацыі на Беларусі, развіцця незалежных сродкаў масавай інфармацыі і грамадзянскай супольнасці ў нашай краіне.

**Ул. інф.**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# Каб адчуць, што такое воля, трэба пабываць у турме

**Усё амаль, як у кіно. Памятаеце: «а ў турме цяпер макаро-о-ны даюць!» Даюць макароны і ў гарадзенскай турме. Праўда, толькі па дзесяць грамаў у суткі на чалавека. Так што, калі захочаш крыху пабыць «італійцам», даводзіцца збіраць гэтыя макароны некалькі дзён.**

І ўсё ж знаходзяцца асобныя «галовы», што пачынаюць зайздросціць зэкам. Маўляў, у нас у краіне не кожны інтэлігент апрануты, дагледжаны і пакормлены тры разы на дзень.

Банальна, але для таго, каб адчуць, што такое воля, трэба пабываць у турме. Хоць некалькі гадзін. Увесь час хацелася зазірнуць за гэты колькіметровы белы мур і шчыльную браму з надпісам УЖ-15/СТ-1. І вось падвярнулася нагода - кіраўніцтва гарадзенскай турмы ласкава зрабіла для журналістаў Дзень адкрытых дзвярэй.

## Сядзем усе

Папярэджанне на дзвярах «Больш за трох не ўваходзіць!», вузкія лесвіцы і краты, якія суправаджаюць нас падчас усёй «вандроўкі» - першыя ўражанні ад гарадзенскай турмы.

Здымаць начальнік турмы Іван Папутка нехаця, але дазваляе, з агаворкай «акрамя ахоўных збудаванняў». Баяцца ўцёкаў. І хоць у гэтым плане турма дастаткова непадступная, начальства адзначае, што дробненькія змовы і закалоты сустракаюцца амаль штогод.

Усяго пенітэнцыярная сістэма Беларусі налічвае 37 установаў. Гэта калоніі, СІЗА, ВТК, ЛТП і дзве турмы ў Гродне і Магілёве. Тэрмін пазбаўлення волі ў іх адбываюць болей як 62 тысячы чалавек, пры ліміце напаўняльнасці 41,5 тысячы. Па колькасці асуджаных на тысячу насельніцтва Беларусь займае трэцяе-чацвёртае месца ў свеце. У суседняй Расеі сітуацыя яшчэ горшая - асуджаных там каля аднаго мільёна. Уся прычына, на думку Анатоля Нікалаевіча, начальніка Гарадзенскага абласнога ўпраўлення па выкананню пакаранняў, у дапатопнасці крымінальнага заканадаўства, «якое адстае ад рэаліяў жыцця». Для параўнання палкоўнік Нікалаевіч прывёў краіны Захаду, дзе за нязначны крадзеж не садзяць у турму, а даюць вялікія штрафы.

**Гарадзенская турма для многіх становіцца домам**
**Пазбаўленне волі**
**- да аднаго года - ніводнага чалавека;**
**- ад 3 да 5 - 80 чалавек;**
**- ад 5 да 10 - 156 чалавек;**
**- ад 10 да 15 - 143 чалавека;**
**- ад 15 да 20 - 3 чалавека;**
**- звыш 20 - 4 чалавекі.**

## Насельніцтва турмы

На тэрыторыі Гарадзеншчыны дзейнічае чатыры папраўча-працоўныя ўстановы. Акрамя турмы, гэта папраўча-працоўная калонія строгага рэжыму ў Ваўкавыску, ППК на Дзятлаўшчыне і ЛТП у Навагрудскім раёне.

Гарадзенская турма разлічана на 760 чалавек. Але колькасць тых, хто адбывае тут пакаранне, часта даходзіць да тысячы.

Кантынгент самы разнастайны. 114 сядзіць за наўмыснае забойства, 11 - за згвалтаванне, і далей практычна ўсе «зорныя артыкулы Крымінальнага Кодэкса». Пераважная большасць - рэцыдывісты. 165 асуджаных сядзяць па трэцяму разу, 32 - па чацвёртаму, васьмёра маюць па сем судзімасцяў. Быў у турме і свой «фаліянт» - 14 разоў асуджаны. Яшчэ адна лічба - 80 працэнтаў асуджаных - псіхічна хворыя і стаяць на ўліку. Ёсць і «вор в законе», менскі. Праўда, як адзначае кіраўніцтва турмы, нейкі незразумелы. Малады і без абавязковых зладзейскіх рэгаліяў.

**Турэмны рацыён на суткі ў Гарадзенскай турме**
**чорны хлеб - 500 г**
**(для тых, хто працуе)**
**крупа - 90 г**
**макароны - 10 г**
**мяса - 40 г**
**рыба - 70 г**
**тлушч - 15 г**
**цукар - 20 г**
**бульба - 600 г**
**гарбата - 0,3 г**

## Звычайная гісторыя

«Устаць! Адыйсці да сцяны!» Заходзім у камеру. Жыхароў двое - стары і маладзён. Астатнія яшчэ на працы. Са столі звісае лямпачка, вулічнае святло амаль не трапляе праз шчыльныя краты ў камеру. Старому, назавем яго Віктар, усяго толькі 45, а выглядае на ўсе 60. Сядзіць ужо дзевяты раз. Упершыню сеў, калі меў 19 гадоў. Што такое дом, ён ужо не памятае. Недзе там жывуць тры ягоныя сястры. Яны даўно ўжо кінулі пісаць брату - колькі ваўка не кармі, усё роўна ў лес глядзіць. Віктар належыць да катэгорыі «сацыяльна неабароненых». Пасля турмы яго, відаць, чакае адна дарога - назад. Ён сам выкінуў сябе з нармальнага жыцця, а ў турме заўсёды пападуць акраец хлеба.

## За што сядзім, тое і чытаем

У турме з'яўляецца шмат часу падумаць, падлячыць душу. Да таго ж, кіраўніцтва стварае ўсе ўмовы для гэтага. Хочаш, ідзі ў бібліятэку. Кнігазбор досыць багаты. Уласных сродкаў папаўняць яго ў турмы няма, аднак менш-больш дапамагаюць гарадскія бібліятэкі. Што да чытацкіх інтарэсаў, то, як трапна сказаў начальнік турмы, «за што сядзяць, тое і чытаюць» - дэтэктывы. Некаторых цягне і на класіку.

Выпісвае турма і больш за 100 найменняў прэсы, але толькі дзяржаўнай. Штотыдзень адпраўляюць службу ў адмысловым рэлігійным пакойчыку капелан і ксёндз. Розныя хрысціянскія брацтвы забяспечваюць асуджаных рэлігійнай літаратурай.

У пакоі псіхалагічнай разгрузкі стаіць столік са шклянкамі для гарбаты, кніга Дзюркгейма «Самагубства» і кружэлкі Queen, Pink Floyd, Аляксандра Кальянава. Галоўнае тут - дапамагчы асуджаным знайсці самога сябе і прыстасавацца да кардынальна новых умоваў існавання.

## Рабі труну, каб выжыць

Сёння для гарадзенскай турмы прыйшлі цяжкія часы. Пачалася пасяўная - і бюджэтныя грошы кінулі туды. Турма ўжо вінаватая 19 мільёнаў рублёў, з іх 11 - за харчаванне. Кожны асуджаны абыходзіцца дзяржаве ў 40 тысяч рублёў штомесяц. За першыя тры месяцы гэтага года гарадзенская турма «з'ела» ўжо 90 мільёнаў рублёў, і сродкаў усё роўна не хапае. Не хапае шмат на што: і на харчаванне, і на бібліятэку, і на грамадзянскую вопратку для вызваленых.

Аднак турма спрабуе выжываць. Асуджаныя шыюць, цяслярнічаюць. Інкруставаныя шкатулкі, зробленыя рукамі зэкаў, прадаюцца ў многіх гарадскіх крамах. Самы ходкі тавар - труны. Танныя, і набыць іх можна ў любы час дня і ночы.

Яшчэ ў гэтым годзе павінна быць абвешчана амністыя. Аднак насельнікаў гарадзенскай турмы яна амаль не закране. Гэтыя артыкулы Крымінальнага Кодэкса практычна не падлягаюць дараванню. Больш таго, кіраўніцтва турмы настроена песімістычна. Кажуць, што хутка давядзецца дабудоўваць трэці паверх у нараў.

**Павал Мажэйка**



Турма - гэты ракурс большасць гарадзенцаў не бачыла



А гэта - следчы ізалятар

# Абаронім Айчыну самі!




**Пад такім лёзунгам гарадзенскія арганізацыі «Маладога Фронту», «Маладой Грамады» ладзілі 23 красавіка з 11-й да 12-й гадзіны несанкцыянаваны пікет каля Дома сувязі.**

Моладзь агітавала за правядзеньне вайсковае рэформы, якая б вырашыла праблемы з прафэсыйным войскам, альтэрнатыўную вайсковую службу. Вялікая колькасьць плякатаў, два зарэгістраваныя сьцягі - БНФ і БСДП(НГ), раздача ўлётак - усё стварала ўражаньне скаардынаваных дзеяньняў маладой апазыцыі. Акрамя гэтага, людзям, што ішлі на рынак, было раздадзена каля 500 улётак з тлумачэньнем ды сабрана каля сотні подпісаў за ажыцьцяўленьне ў краіне вайсковае рэформы. Подпісы працягвалі зьбіраць нават пасьля адыходу большасьці ўдзельнікаў акцыі. Удзельнікі паабяцалі, што гэтая акцыя будзе працягвацца.

**Андрэй Мялешка**

**На здымку: удзельнікі антывайсковай акцыі 23 красавіка**

# Так святкуюць, што няма калі і касцей сабраць

**Сёння на Гарадзеншчыне жыве 11328 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, з якіх 11025 прайшлі вайну «ад званка да званка». У дні святкавання Перамогі ўрачыстасці пройдуць ва ўсіх гарадах і вёсках Гарадзеншчыны.**

У абласны цэнтр будуць запрошаны прадстаўнікі ад кожнага раёна на ўрачысты прыём у старшыні аблвыканкама. Франтавікі Герой Савецкага Саюза Іван Лебедзеў і Георгі Глонці вылучаны абласным Саветам ветэранаў на паездку ў Маскву, дзе таксама прымуць удзел ва ўрачыстасці. З першага траўня па трэцяе ліпеня ўсе ўдзельнікі вайны атрымаюць памятныя знакі да 55-й гадавіны Вялікай Перамогі. Напрыканцы красавіка чакаецца іх завоз з Расеі.

У Гродне дыслакуецца адзіная на прасторах СНД пошукавая рота. Усяго ў вобласці выяўлена 321 магіла воінаў, дзе знайшлі апошні супакой 62 650 савецкіх салдатаў. З іх вядомы прозвішчы толькі 9 129 чалавек. Асабліва шмат непахаваных парэшткаў чырвонаармейцаў у Ліпічанскай пушчы. Яны загінулі ўлетку 1941 года, калі трапілі ў так званы «навагрудскі кацёл».

**Сцяпан Ярашчук**

# Напамін пра Божую кару

**У вёсцы Галынка Зэльвенскага раёна ідзе будаўніцтва праваслаўнага храма.**

Будаўнічая пляцоўка не агароджана, але там знаходзіцца шмат матэрыялаў. Відаць, вернікам цяжка супрацьстаяць бязбожным прыватызатарам па-савецку, і таму яны прызвалі на дапамогу Бога. На дошцы яны напісалі фарбаю «Не тронь, Господь накажет» ды змясцілі шыльду на бачным месцы.

**Язэп Палубятка**

# Ахвяраў СНІДу стала больш

У Лідзе стала болей хворых на СНІД. За апошнія тры тыдні хвароба знайшла яшчэ 14 ахвяраў, а агульная колькасьць інфікаваных дасягнула 67 чалавек. На барацьбу з эпідэміяй накіраваная дэлегацыя Рэспубліканскага савету па прафілактыцы хваробы.

# Выдадзена пяцітысячнае пасьведчаньне сябры БНФ

**18 красавіка пасьведчаньне сябры БНФ зь пяцітысячным юбілейным нумарам было ўрачыста ўручанае ў мястэчку Наваельня Дзятлаўскага раёну. Атрымала яго настаўніца беларускай мовы і літаратуры Наваельнянскай сярэдняй школы Ганна Дудар. Уручалі юбілейнае пасьведчаньне старшыня БНФ «Адраджэньне» і Партыі БНФ Вінцук Вячорка і яго намесьнік Вячаслаў Сіўчык.**

«Тое, што мы выпісваем пяцітысячнае пасьведчаньне ня значыць, што нас толькі пяць тысячаў, бо ў БНФ ёсьць сябры арганізацыі, якія прымаюць на сябе асноўны цяжар працы, а ёсьць прыхільнікі, якіх вельмі і вельмі шмат. Асабліва прыемна, што актывісты БНФ - гэта нашая нацыянальная інтэлігенцыя», - зазначыў Вінцук Вячорка.

Зараз у Наваельні існуюць тры суполкі БНФ, якія налічваюць 19 сябраў.

**Ул. інф.**

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



ПРАЦЯГ ДЫСКУСІІ

# А белы параход плыве ўдалячынь

## Дзяржава спрабуе перакласці свае праблемы на плечы бязмоўнай ракі

**Нагадаем чытачу, што размова вядзецца пра дзве пляціны: Гарадзенскую электрастанцыю, якую мяркуюць узвесці ў дзесяці кіламетрах ад горада вышэй па цячэнню, і Нямноўскую, мяркуемае месца створу - раён вёскі Пальніца (<u>«Галоўны контраргумент - Нёман», ПАГОНЯ №13 ад 20 красавіка 2000 года</u>). А першай з гэтых дзвюх энергетыкі выбралі Гарадзенскую. Акурат у дзень майго візіту ў Гроднаэнерга група спецыялістаў збіралася ад'ехаць у раён пасёлка Берагавы, каб яшчэ раз паглядзець і, відавочна, даць нейкую ацэнку выбару створу. Наведванне ж мною цэнтра кіравання ўсёй гарадзенскай энергетыкай было выклікана жаданнем высветліць, ці існуе альтэрнатыва будаўніцтва ГЭС.**


Ой, Нёман, ой, бацька наш родны!..

### Сонца, вецер і арганіка

Гутарка з Валерыем Курачкіным, начальнікам Аддзела нетрадыцыйнай энергетыкі, па сутнасці, вылілася ў спробу даказаць, што такой альтэрнатывы няма. Сонца можна нават не разглядаць у якасці крыніцы электраэнергіі: у нашай мясцовасці яно не песціць нас нават добрым надвор'ем. А вось вецер - зусім іншая справа. У вобласці нават вызначана 550 патэнцыйных пляцовак, дзе можна паставіць ветраўстаноўкі, а 18 з іх маюць неблагую сярэднюю хуткасць ветру - 7,3 м/с. Праблема ў коште гэтых установак. Цана імпартных складваецца з разліку 3 тысячы даляраў на адзін КВт электраэнергіі. Акупяць яны сябе гадоў праз 20-25. Аднак далей спадар Курачкін дадаў, што ёсць умельцы і ў нашай дзяржаве, напрыклад, прыватны прадпрымальнік па прозвішчы Пашкоў. Ён стварыў свае ветраўстаноўкі магутнасцю каля 4 КВт, 20 КВт і нават каля 100 КВт. Пры гэтым яны танней за імпартныя болей як у чатыры разы.

Існуюць яшчэ ўстаноўкі, якія выпрацоўваюць электрычнасць пры спальванні разнастайнай арганікі, напрыклад, адходаў жывёлагадоўлі, карацей кажучы, гною. Так, пагадзіўся са мною Валерый Курачкін, ёсць такія распрацоўкі, да прыкладу, у Запарожжы, але іх энергетыкі лічаць малаэфектыўнымі, не вартымі ўвагі. Вось, уласна, і ўсё. Хаця, чакайце, а рэсурсы энергазберажэння?

### Што маем - не шануем...

На самой справе, менавіта тут схаваны каласальны патэнцыял дадатковай энергіі. Толькі пры транспарціроўцы страты электраэнергіі, паводле дадзеных спецыялістаў, складаюць у нас болей за 10 працэнтаў. Для параўнання: будаўніцтва Гарадзенскай ГЭС на 10-15 МВт дадасць у агульную магутнасць абласной энергасістэмы не больш як сем працэнтаў. Велізарныя страты адбываюцца ў асенне-зімне-веснавы перыяд, калі трэба абаграваць памяшканні і даставляць спажывальнікам гарачую ваду. (Гэта наогул тэма асобнай размовы). Але на барацьбу са стратамі патрэбныя і грошы немалыя. А іх, як вы, відавочна, здагадваецеся, няма. Ды і скуль жа ім быць пры зусім абсурднай сістэме аплаты электраэнергіі спажывальнікамі. Нават зараз, пасля падвышэння тарыфаў, кошт электраэнергіі для насельніцтва складае ўсяго 3,6 рубля за 1 КВт/г. Лічы задарма. Хто ж за яе, гэтую самую энергію, плаціць? Дзяржава паспрабавала перакласці гэты цяжар на прадпрыемствы. Іх тарыф у чатыры разы вышэйшы. Але далёка не ўсе з гэтым паспяхова спраўляюцца. У дадатковых тлумачэннях прычыну неплацяжоў, мабыць, няма патрэбы. Дарэчы, зараз існуе ўстойлівая тэндэнцыя пераходу асобных вытворцаў на сваю ўласную крыніцу энергіі, г.зн. папрасту да будоўлі сваіх кацельных і адмаўлення ад паслуг Гроднаэнерга. Гэта азначае, што рэальных плацельшчыкаў на вачах становіцца ўсё меней. Што будзе далей?

### Бясплатнай электрычнасці не бывае

У краінах з нармальнай, нескажонай эканомікай усё якраз наадварот: насельніцтва аплочвае электраэнергію па больш высокаму тарыфу і без усялякіх скідак. Калі верыць падлікам спецыялістаў, наш тарыф складае не болей за 4-5 працэнтаў ад рэальнага, гэта значыць, калі плаціць па поўнай праграме, сумы на рахунках за электрычнасць падвысяцца ў 20 разоў. Але дзяржава, відаць, яшчэ не хутка адважыцца на такое падвышэнне тарыфаў. За гэтым крокам павінна рушыць цэлая лавіна наступстваў, адно з якіх - падвышэнне заробкай платы працоўным. Але на гэта ў нас грошай што? - правільна - іх няма.

Кіраўніцтва Беларусі загнала сябе ў кут, але адступаць не мае намеру. Палітычнай волі для таго, каб перавярнуць эканоміку з галавы на ногі, няма. А праблемы, такія як энергазабеспячэнне, вырашаць трэба. І тут знаходзяцца руплівыя хлопцы з фірмаў, што праектуюць і ўзводзяць гідразбудаванні. Разумеючы, якое фінансаванне можна забяспечыць сабе на гэтым праекце, яны з усяе моцы будуць запэўніваць мясцовыя ўлады і вышэйшае кіраўніцтва ў крайняй неабходнасці каскаду плацінаў. ГЭС называюць таннай і экалагічна чыстай крыніцай (відавочна, у процілегласць палохаючым усіх АЭС) электраэнергіі. Адсутнасць радыяцыі ў гэтым варыянце відавочнае, а вось наконт наступстваў для самой ракі і яе экалогіі, дазвольце не пагадзіцца.

### Пасёлак Берагавы - Нью-Васюкі

У Дэкларацыі пра намеры інвеставання будоўлі ГЭС праектанты не скрываюць, што «тэндэнцыя змены навакольнага асяроддзя» выявіцца ў «шматлікіх паказчыках». У вадасховішчы, якое працягнецца на 50 кіламетраў і дасягне пасёлка Лунна, узровень вады падвысіцца на шэсць-сем метраў. Так, берагі ў Нёмана высокія, але не ўсюды. Напрыклад, у раёне ўпадзення рэчкі Свіслач разліў будзе даволі вялікі. Далей, гідраінжынеры ўказваюць на тое, што выпарванне з воднай паверхні ствараемага вадасховішча павялічыцца на 65 працэнтаў. Як пры гэтым будзе дзейнічаць водазабор «Пагараны», які забяспечвае вадою паўгорада? А яшчэ не лічана, колькі вады будзе страчана пры дрэніраванні. Як будзе выглядаць Нёман ніжэй пляціны? Ёсць яшчэ шмат пытанняў наконт паводзінаў узважаных наносаў, стану водных арганізмаў і рыбаў, жывёльнага і расліннага свету, які трапляе ў зону затаплення.

Затое ў праекце (выбачайце, пакуль у Дэкларацыі) немалое месца адведзена светлым перспектывам па добраўпарадкаванні зонаў адпачынку, а таксама развіцці суднаходства і воднага турызму на новым вадасховішчы. Уяўленне адразу намалявала прыстань з мностам яхтаў, а міма яе амаль бясшумна праплыў белы цеплаход. Казка! А на самой справе - не болей як прыгожая абгортка для звычайнай жалезабетоннай ідэі. Фанцік, які рэдка хто захоўвае. Як правіла, яго выкідваюць. Не ўзвядзенне збудавання, якое дорага каштуе, дае штуршок развіццю інфрастуктуры адпачынку, а дынамічнае развіццё эканомікі, бізнесу, прадпрымальніцтва, рост грашовых даходаў насельніцтва і д.п., чаго ў нас, на жаль, не назіраецца нават у плане тэндэнцыі.

**Ніна Палуцкая**

(Працяг будзе)

# Пра мудры ЖЭС

**Мікрараён па вуліцы Шчорса лічыцца самым экалагічна неспрыяльным у горадзе. Будучы раней у ваенным ведамстве, ён так і застаўся недобраўпарадкаваным. У мінулыя часы, калі людзі яшчэ верылі ў моц народных абраннікаў у гарсавет, жыхары гэтага мікраёна неаднойчы звярталіся да сваіх дэпутатаў з калектыўнымі просьбамі разбіць парк паміж мікраёнам і урочышчам «Сакрэт». Але...**

Міналі гады. Падчас дачнай ліхаманкі жыхары крайніх у горадзе жылых дамоў «акультурылі» сумежную тэрыторыю агародамі, у якія ўклалі свой час, працу, душу, а хто і грошы - дзеля паляпшэння структуры глебы. Потым на пустэчы з'явіўся сапраўдны палац...для псіхічна хворых. А навокал - разрытая будаўнічай тэхнікай зямля.

Нядаўна на жылых дамах з'явіліся аб'явы, у якіх, грунтуючыся на рашэнні (санітарна-гігіенічнага характару) мясцовых уладаў, ЖЭС забараняе надалей апрацоўваць дзялянкі. У выпадку непаслушэнства ЖЭС пагражае ў траўні-чэрвені пераараць дзялянкі. Няўжо ў кагосьці падыме рука здзейсніць пагрозу? А мо замест з'явіцца парк - прадмет даўняй мары шчорсаўцаў?

**Сяргей Марозаў**

# У мінулым годзе ў Гродне пабудавана жылля амаль удвая менш запланаванага. Ці будзе выкананы план на гэты год?

**У мінулым годзе ў Гродне была праваленая праграма жыллёвага будаўніцтва: паводле задання на ўвод у эксплуатацыю жылых дамоў і жылой плошчы ў памеры 153,903 тысячы квадратных метраў фактычна было ўведзена 102,127 метраў жылой плошчы, што складае ўсяго 66,6 працэнта ад запланаванага.**

Аблвыканкам запланаваў на 2000 год пабудаваць у Гродне 140,2 тысячы квадратных метраў жылля. Выкананне гэтых лічбаў таксама праблематычнае. Галоўная прычына невыканання планаў - гэта абмежаванае, недастатковае фінансаванне будаўніцтва. У нармальнай эканоміцы той, хто хоча нешта будаваць, павінен за гэта заплаціць з уласнай кішэні, альбо ўзяць пазыку. А што прыдумала гарадзенская «вертыкаль»?

Вядома што: яна ўтварыла «штаб па арганізацыі, каардынацыі і кантролю за ходам будаўніцтва жылля». Адначасова загадала прадпрыемствам, якія будуюць жыллё сваімі сіламі, «забяспечыць увод жылых дамоў». Таксама прадпрыемствам загадана аказваць матэрыяльную дапамогу ў будаўніцтве жылля сваім супрацоўнікам, а філіям «Беларусбанка» - «забяспечыць беспрапыннае крэдытаванне». Пра тое, дзе прадпрыемствы возьмуць грошы, ні «вертыкаль», ні штаб не гавораць. Хаця лагічна было б прадугледзець падатковыя ільготы хаця б на суму выдаткаваных прадпрыемствамі на будаўніцтва жылля грашовых ці матэрыяльных рэсурсаў. Замест гэтага гарвыканкам дае «каштоўныя рэкамендацыі» жыллёвым каапераваным ды іншым забудоўшчыкам «набываць інжынернае абсталяванне за ўласны кошт». А дзе забудоўшчыкі, большасць з якіх маюць заробкі ў памеры пражытковага мінімума, возьмуць на гэта грошы - ізноў маўчанне.

Затое Гарадзенскі гарвыканкам умее карыстаць фармулёўкамі старадаўніх гадоў, за якімі не стаіць ніякіх канкрэтных дзеянняў. Так, ён абавязаў рашэннем ад 15 сакавіка N188 Ленінскую і Кастрычніцкую адміністрацыі «прыняць неабходныя меры па безумоўнаму выкананню праграмы 2000 года па будаўніцтву жылля паводле даведзеных заданняў». Ізноў - ні слова пра грошы.

Асобамі, адказнымі за выкананне рашэння, прызначаны намеснік старшыні гарадзенскага гарвыканкама Ю.Масквічоў і «вертыкальныя» абодвух гарадскіх раёнаў Б.Казлкоў і В.Нікалайчык. Ці ёсць у іх магчымасць перакласці адказнасць на каго-небудзь ніжэйшага альбо знайсці неабходныя для будаўніцтва жылля грошы?

**Сяргей Самасей**




# І зноў падман

**Неяк у сярэдзіне першага квартала гэтага года ўсе дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, як у звон званілі, перадаючы насельніцтву нашай рэспублікі ды не толькі нашай рэспублікі, а ўсім краінам СНД, што наш «усенароднаабраны» А.Лукашэнка вырашыў зрабіць добрую справу так, як яго калісьці вучылі ў савецкай школе. Добра ведаючы жабрацкі стан свайго народа, асабліва пенсіянераў, даведзеных да звычайнай бальшавіцка-камуністычнай галечы, ён надумаў іх крыху пацешыць: кампенсаваць ім грошы, якія ў іх скрала, развальваючыся, камуністычная сістэма. Пры гэтым, у паведамленні неаднаразова падкрэслівалася, што гэта адзіная рэспубліка з усіх СНД, якая адважылася на такі адказны крок і знайшла на гэта сродкі.**

Праўда, паверыць ў гэта было цяжка нават па-дзіцячы даверлівым пенсіянерам, ведаючы стан эканомікі ў нашай дзяржаве ды той напрамак, у якім яна «развіваецца». Але ўсё ж такі зноў паверылі і пабеглі ў ашчадныя касы. Там іх уважліва выслухалі, ласкава прапанавалі напісаць заявы і запрасілі праз пэўны час прыйсці за чэкамі, на якія можна будзе купіць у магазінах неабходныя тавары, бо наяўнымі даваць грошы пастановай не прадугледжвалася.

«Чэкі дык чэкі», - вырашылі пенсіянеры і шчаслівыя пайшлі дахаты.

Праз пэўны час - пенсіянеры зноў каля акенцаў ашчадных касаў. Ім ізноў ветліва прапанавалі атрымаць чэкі. Але калі яны даведаліся, на якую суму ў цяперашніх цэнах ім выдадуць чэкі, то радасць іх імгненна знікла, а замест яе з'явіліся крыўда, адчай і праклён таму, каго навучылі ў савецкай школе так цынічна падманваць людзей. Чалавек, які на 1991 год меў суму, роўную кошту 10-ці халадзільнікаў або 25-ці касцюмаў, зараз атрымліваў чэкаў на...тры кілаграмы каўбасы. Вось да якога нахабнага дзікунства дайшлі вышэйшыя эшалоны нашай улады.

Вось і скончылася ўся папуліцкая шуміха з кампенсацыяй укладаў насельніцтву, а з ёю і радасць пенсіянераў ды надзея на апошні «промень святла ў цёмным царстве». Затое працягваецца і з кожным днём узмацняецца прапаганда аб'яднання Беларусі і Расеі ў адну дзяржаву, неабходнасці ўводу расейскіх войскаў у Беларусь і г.д. Недалёка той час, калі пачуем пра неабходнасць паездкі нашых хлопцаў у Чачню...

**Серафім Хват**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# Лістападаўскае паўстанне 1830 года і ўдзел у ім Міхала Валовіча

**Працяг. Пачатак у №13**

Запозненая акцыя па захопу Вільні скончылася паразай. Апрача таго, што на подступах да Вільні, на Панарах, было забіта і паранена каля 2 тысяч жаўнераў, адбылася агульная дэмаралізацыя войска. З гэтага часу корпус Гелгуда ўвесь час знаходзіўся ў адступленні. Валовіч пад камандаваннем генерала Шыманоўскага яшчэ прымаў удзел у бітвах пад Шаўлямі, Душвэнтамі, Повэндэнямі і Новым Мястам. Каб пазбегнуць канчатковага разгрому і хоць часткова вывесці войска да Варшавы, пад Куршанамі корпус Гелгута падзялілі на тры часткі, камандаваць якімі прызначаны былі генералы Хлапоўскі, Дэмбінскі і Рогланд, з якім быў і Гэлгут. Каб увесці ворага ў зман, кожнаму быў вызначаны свой маршрут да Варшавы. Але толькі Дэмбінскі, прадзіраючыся сярод мноства небяспечнасцяў і нечаканых сутычак, здолеў, прайшоўшы 120 міляў па Гарадзеншчыне (Жодзішкі-Смаргонь-Наваградак-Дзятлава-Зэльва-Поразава), прыйсці да Варшавы.

Па дарозе да Дэмбінскага ў Ашмянскім павеце далучыліся паўстанцкія атрады Матушэвіча і палкоўніка Пшэсдзецкага. У Наваградку далучыліся паўстанцы на чале з Язэпам Кашыцам, якія перад падыходам Дэмбінскага напалі на рускі гарнізон і прымусілі каменданта Фэлькерсамба пакінуць горад. Пры гэтым занялі астрог і, пакінуўшы там крымінальнікаў, астатнім прапанавалі далучыцца да паўстанцаў. Рускі генерал Станкевіч, які даведаўся ў Слоніме пра захоп Наваградка, спешна выступіў з васьмітысячным корпусам супраць паўстанцаў, аднак сустрэўшыся з корпусам Дэмбінскага, не прымаючы бой, адступіў назад у Слонім. Тым часам слонімскія паўстанцы на чале з Цітусам Пуслаўскім і Антонам Бронскім таксама далучыліся да корпуса Дэмбінскага.

Групоўкі Хлапоўскага, Рогладa з Гелгудам, ухіляючыся ад сутычак з рускімі войскамі, накіраваліся да Варшавы па-за прускай мяжы, але, прыціснутыя рускімі войскамі да яе, перайшлі 15 ліпеня ў Прусію, склалі зброю, былі інтэрнаваныя і змешчаныя ў лагер. Тут быў і Валовіч. Сярод салдатаў і афіцэраў было такое абурэнне кіраўніцтвам Гелгуда, што пры пераходзе прускай мяжы капітан Скульскі яго застрэліў.

Валовіч і чатыры ягоныя сябры таемна пакінулі лагер, купілі сялянскую вопратку і вырашылі вярнуцца ў Польшчу. Але прускія жаўнеры схапілі іх і аддалі пад суд. Валовіч з сябрамі былі пасаджаныя ў турму ў Тыльзіце, а потым пераведзеныя ў Пілаў, дзе сядзелі са злодзеямі і забойцамі.

Праз некаторы час іх выпусцілі з турмы і перапправілі ў Францыю, дзе ў Парыжы Міхал сустрэўся са сваім бацькам, які з корпусам Дэмбінскага вярнуўся спачатку ў Варшаву, а затым таксама перайшоў у Прусію і выехаў у Францыю. Тут у эміграцыі ўжо знаходзілася больш як 250 былых паўстанцаў з Гарадзенскай губерні.

За заслугі ў паўстанні Валовіч, як і Пржаслаўскі, 4 кастрычніка 1831 года Цэнтральным урадам Польшчы былі ўзнагароджаныя залатымі кавалерскімі Крыжамі.

А гэтым часам, калі бацька і сын Валовічы знаходзіліся на эміграцыі ў Францыі, 19 кастрычніка 1831 года выйшаў указ Мікалая I, у якім загадвалася Віленскаму і Гарадзенскаму ваеннаму губернатару князю Далгарукаву арганізаваць ваенны суд над паўстанцамі на месцах іх злову і здзяйсняць смяротныя выракі там, «где ими злодеяния их учинены». З 8 лістапада 1831 года да 11 снежня 1834 года ў Гродне засядала губернская следчая камісія «для определения степени вины мятежников, секвестра и конфискации их имений». У шляхты, абшарнікаў і манастыроў было канфіскавана толькі маёнткаў: у Гарадзенскім павеце - 3, у Ваўкавыскім - 5, у Лідскім - 10, у Наваградскім - 12, у Слонімскім - 19. Гарадзенскай губернскай камісіяй 19 кастрычніка 1832 года бацька і сын Валовічы былі прылічаныя да злачынцаў другой катэгорыі, а іх маёнтак Парэчча з 220 душамі быў канфіскаваны на карысць дзяржавы. Былі адабраны гаспадарскі дом, дом эканома, вінакурня, валоўня, корчмы, прыхадская ўніяцкая царква з домам святара, а таксама мноства другіх пабудоваў. Забралі 145 тамоў кніг на польскай мове, 9 тамоў на нямецкай і 9 тамоў на французскай мовах, якія потым былі вывезеныя ў Пецярбургскую публічную бібліятэку. З жывёлы былі канфіскаваны тры каровы і шэсць цялятаў, бо, як сказана ў справе аб секвестры маёнтка, 50 галоваў дваровай рагатай жывёлы без догляду да гэтага здохла.

У Парыжы Валовіч прымаў чынны ўдзел у эміграцкім жыцці. Быў сябрам Ляляевеля і прыхільнікам яго ідэяў. Уваходзіў у Нацыянальны польскі камітэт, прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Таварыства літоўскіх і рускіх земляў пад кіраўніцтвам Цэзара Плятэра. Належаў да той групы палымяных патрыётаў Дэмакратычнага Таварыства, якія прагнулі распачаць барацьбу за пабудову грамадства на новых, больш дэмакратычных асновах. Аналізуючы прычыны недастатковага ўдзелу людзей у лістападаўскім паўстанні, як галоўнай прычынай яго заняпаду, лічыў адсутнасць у большасці радавых паўстанцаў агульналюдскіх інтарэсаў. Быў у групоўцы той моладзі, што прытрымлівалася поглядаў Т.Крэмпавецкага, які заяўляў: «Аб апошнім паўстанні сцвярджаю, што яно было падхоплена толькі шляхтай, якая хацела скінуць уладу Мікалая, каб мець магчымасць яшчэ бескантрольней і мацней прыгнятаць сялянаў, выкарыстоўваючы для гэтага царскі дэспатызм». А таму адбудову незалежнай дэмакратычнай Літвы, звязанай федэратыўнымі адносінамі з Польшчай, лічыў, што пачынаць трэба з грамадскіх рэформаў, з адмены прыгонніцтва і надзелу сялянаў зямлёю, з абуджэння іх нацыянальнай свядомасці. Сродкам дасягнення дэмакратычнага і справядлівага грамадства лічыў сацыяльную рэвалюцыю агульнаеўрапейскага маштабу. «Эміграцкая хроніка» згадвае Валовіча як чалавека, адданага рэспубліканскім прынцыпам.

У гэты час патрыятычныя эміграцкія колы зближаюцца з Вярхоўным кіраўніцтвам тайнага карбанарцкага Інтэрнацыяналу і чынна рыхтуюцца распачаць у першай палове 1833 года агульнаеўрапейскае паўстанне прыгнечаных народаў супроць манархаў Еўропы. У поспех такога паўстання шчыра паверыў і Валовіч. Асабліва тады, калі за падрыхтоўку і правядзенне яго на Беларусі ўзяўся палкоўнік Юзаф Заліўскі, адзін з арганізатараў лістападаўскага паўстання 1830 года ў Польшчы. Ягоная ідэя зводзілася да арганізацыі шырокага вызвольнага партызанскага руху. Паводле планаў Заліўскага, на Беларусь павінны былі выехаць усе патрыёты-эмігранты і ў сваіх родных мясцінах пачаць барацьбу за вызваленне сялянаў ад паншчыны, надзяленне іх зямлёю, аб'явіць вайну расейскаму паняволенню.

Для аператыўнага кіраўніцтва паўстаннем уся тэрыторыя Беларусі была падзелена на акругі, у склад якіх увайшло па два паветы. На чале акруг ужо ў Парыжы зацвярджалі начальніка, а той сам падбіраў намесніка і двух памочнікаў. Міхал Валовіч пагадзіўся стаць паўстанцкім начальнікам слонімска-наваградскай акругі. Марцэль Шыманскі - гарадзенскае акругі, Юзаф Гардынскі - беластоцка-сакольскай, Адам Пішчатоўскі - віленскай. Была пастаўлена задача, каб да пачатку «...усеагульнага выступу прыгнечаных народаў Еўропы» ўсе кіраўнікі акругаў знаходзіліся на месцы і падрыхтавалі сялянаў у патрэбны момант актыўнымі выступленнямі спрыяць звяржэнню ўсіх манархаў Еўропы, у першую чаргу - расейскага цара.

У пачатку сакавіка 1833 года патрыёты невялічкімі групкамі з фальшывымі пашпартамі рушылі з Францыі праз Швейцарыю, Баварыю, Саксонію, Галіцыю ды Прусію на Бацькаўшчыну. Многія не вытрымалі цяжкасцяў блукання па чужых краінах і вярнуліся назад. Іншыя былі схопленыя ўжо на мяжы. Але найбольш здатныя, як было дамоўлена, да 19 сакавіка перайшлі мяжу і распачалі падрыхтоўку паўстання. Сярод іх быў Міхал Валовіч са сваім памочнікам Язэпам Яцкевічам. Пешшу, па веснавым бездарожжы, абмінаючы вёскі, маючы пры сабе два рэвальверы, камплект бялізны і 55 рублёў грошай, яны спачатку дабраліся ў Ваўкавыскі павет да Міхалавай сястры Ганны, якая была замужам за Дамянікам Аскеркам, былым маршалкам ваўкавыскай павятовай шляхты. За ўдзел у Патрыятычным таварыстве Дамянік Аскерка быў асуджаны напрыканцы 1830 года і высланы ў Варонежскую губерню, адкуль вярнуўся толькі ў мінулым годзе і знаходзіўся пад наглядам паліцыі. Спазнаўшы пакуты выгнанніка, ён раіў Валовічу адмовіцца ад задуманага, пакінуць Бацькаўшчыну і вярнуцца за мяжу. Калі ж не даў рады пераканаць у гэтым Валовіча, пакінуў настойваць і нават садзейнічаў знаёмству з абшарнікам Шабанскім, які 10 дзён хаваў іх у фальварку Бараўшчына і дапамог Валовічу звязацца з Міхалам Песакоўскім, былым прыгонным бацькі Валовіча, якому 13 гадоў таму была дараваная вольнасць. Потым Песакоўскі працаваў эканомам у Валовічаў. Цяпер ён жыў у фальварку Яловікі, што знаходзіўся за Шчараю ў чатырох вярстах ад маёнтка Парэчча.

Але напачатку ўся дзейнасць была спынена з-за хваробы Валовіча. Блукаючы па лясах халоднаю слотнаю вясною, ён моцна прастудзіўся. Цела нібыта агнём гарэла. Амаль беспрытомным ён вярхом на кані дабраўся да Шабанскага. Той прывёз з Ваўкавыску вядомага доктара, які спачуваў паўстанцам, - Ізідара Нагумовіча. Патрыятычныя намеры Валовіча ўзрушылі як Шабанскага, так і Нагумовіча. Яны, як маглі, лячылі Валовіча, але дапамагаць яму разгортваць партызанскі рух пабаяліся.

Песакоўскі без ваганняў далучыўся да Валовіча і ўзяў на сябе абавязкі па забеспячэнні будучага атрада харчаваннем, адзеннем, а таксама наладжваннем сувязяў з мясцовымі сялянамі. Гэта ён прывёў у атрад парэцкага лесніка Лявона Панасюка, якому Валовіч гарантаваў пасля перамогі паўстання даць вольную і бясплатны зямельны надзел. Лявон Панасюк прывёў яшчэ двух парэцкіх хлопцаў, братоў Яна і Базыля Панасюкоў, апошні хаваўся ад рэкруцкага набору. Потым да Валовіча далучыўся Тамаш Васіліцкі, былы ўдзельнік паўстання 1830 года, які пасля яго паразы вярнуўся з Прусіі дадому і быў краўцом ў Шундрах. Прыйшоў у атрад хлопец з Задвор'я - Мікалай Фярадка.

Вялікую надзею на дапамогу Валовіч ускладаў на свайго цёзку па прозвішчы Ян Валовіч, капітана французскіх і польскіх войскаў, які раней служыў упраўляючым маёнтка ў бацькі Валовіча, а цяпер жыў у сваім невялічкім маёнтку Кіеў, у семнаццаці вярстах ад Слоніма. Аднак надзея яго не спраўдзілася. Ян Валовіч, пэўна напалоханы мураўёўскімі пагрозамі жорстка раправіцца з памагатымі паўстанцаў, адмовіў яму ў дапамозе. Але Міхал Валовіч без яго згоды ўсё ж угаварыў двух ягоных сялянаў Аляксандра Лапко і Стэфана Сідаркевіча далучыцца да яго. У хуткім часе атрад павялічыўся да 11 чалавек.

З'явілася патрэба ў наладжванні сувязяў з кіраўнікамі паўстанняў у сумежных акругах і асабліва з Цэнтральным кіраўніцтвам ў Вільні. Гэтым даручылі заняцца Яцкевічу, каму былі вядомыя таямнічыя паролі, на якія адкрываліся падпольныя сябры. Але выканаць даручэнне ён не здолеў. Бо праз два дні, калі Яцкевіч праязджаў у Вільню праз Воранава, там яго западозрыў карчмар Хаім Янкелевіч і выдаў расейскім уладам, пра што, безумоўна, Валовіч не ведаў. Не дачакаўшыся звестак ад Яцкевіча і сігналу з Цэнтра аб пачатку паўстання, Валовіч пачаў дзейнічаць самастойна. Фальварак Яловікі, дзе атабарыўся ў смалакурні Валовіч, ляжаў на паштовым тракце Брэст-Слонім-Вільня, па якім у спецыяльных брычках перыядычна перавозілі казённыя грошы. Вырашылі напасці на такую брычку, забраць грошы, купіць на іх патрэбную зброю і добра ўзброеным атрадам здзейсніць напад на слонімскую турму ды вызваліць зняволеных там былых паўстанцаў, якія павінны былі значна папоўніць іх атрад. А тады, супольна з памежнымі атрадамі, пачаць шырокае сялянскае паўстанне супраць расейскіх уладаў, за адмену прыгоннага права і за надзел сялянаў уласнай зямлёю.



Паўстанец Прынёмання (малюнак 1831 г.)

Дзве першыя засады на пошту рабілі далёка ад Яловікаў, каля Навінаў. Там прасядзелі некалькі дзён. Але высланы Валовічам дазор не здолеў своечасова папярэдзіць аб з'яўленні паштовай брычкі, і яна бесперашкодна абодва разы праехала да Вільні.

Як адбываўся трэці напад на паштовую брычку за Шундрамі, у 15 вярстах ад Слоніма, бачна з данясення паштмайстара Янкоўскага Гарадзенскаму губернатару М.Мураўёву. Падзеі адбываліся так: 26 красавіка (тут і далей даты падаюцца па старому стылю) фурману Пятру Фёдаравічу Мялешку, веры грэка-уніяцкай, селяніну Слонімскай эканоміі вёскі Касцянёва, загадана было запрэгчы коней і ехаць з паштальёнам Гарнышом па Віленскім гасцінцы да станцыі Задвор'е, якая знаходзіцца на 22-й вярсце ад Слоніма. Узялі за пасажыра невядомага габрэя і па дарозе, на 11-й вярсце, у вёсцы Шундры спыніліся каля карчмы, куды зайшлі паштальён Гарныш і той габрэй, а Мялешка застаўся пры конях. Тут паднеслі яму чарку гарэлкі. Калі ад'ехалі ад карчмы чатыры вярсты, з невялікага зарасніку з левага боку выскачылі шэсць чалавек у сялянскай вопратцы, падбеглі да коней і закрычалі «Стой!». Двое заступілі дарогу, а чацвёра другіх хацелі залезці ў брычку. Тады Мялешка бізуном моцна сцебануў коней, тыя падбілі заступіўшых, пераехалі па іх брычкай і, такім чынам, уцяклі. Зброі ў іх не заўважана, бо было цёмна.

Рапарт аб нападзе ноччу шасці разбойнікаў на пошту быў накіраваны Віленскаму губернатару Далгарукаву. Той 28 красавіка загадаў падначаленаму Гарадзенскаму губернатару М.Мураўёву вылавіць нападаючых, дзеля чаго дазволіў выкарыстаць салдатаў, раскватараваных у Слоніме. Праведзеныя мясцовымі ўладамі дзве аблавы вакол гасцінца ад Слоніма да Задвор'я вынікаў не далі. Тады губернатар М.Мураўёў для арганізацыі пошукаў накіраваў у Слонім урадніка па асобых даручэннях маёра Галянкоўскага. Усім жыхарам навакольных вёсак было абвешчана, а ўладальнікам маёнткаў даведзена пад роспіс: калі хто ведае пра нападаўшых на пошту і не паведаміць пра гэта мясцовым уладам, ён будзе цяжка пакараны, а маёмасць канфіскавана. Наладжваліся новыя аблавы, але Валовіч, як спрактыкаваны вайсковец, удала манеўруючы, выводзіў атрад ад пераследу. Калі стала немагчыма хавацца на Слонімшчыне, ён перабраўся ў наваградскія лясы.

Не мог ведаць капітан літоўскай кавалерыі Міхал Валовіч, што яго захопам займаецца Гарадзенскі грамадзянскі губернатар на правах ваеннага губернатара па гораду Гродна генерал-маёр і кавалер Міхаіл Мураўёў. Так пачалося проціборства генерал-маёра Міхаіла Мураўёва з капітанам Міхалам Валовічам.

Дык хто ж такі быў гэты Міхаіл Мураўёў?

**Аляксандр Талерчык**

**(Працяг будзе)**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# РЭКЛАМА Тэлефон: (0152) 72-29-96, 72-37-14




## ПРАДАЮ

Аўтамабіль Фіат-Уно, 1989-1990 года выпуску, бензін, 5-КПП, люк. Кошт - 1600 у.а. Тэл. (8-212) 3-69-03.

Мапед «Рыга-7» з запасным рухавіком. Тэл. 44-38-29.

Дачу ў раёне в.Навумавічы. Тэл. 76-19-29.

Дачны надзел у 2-х км ад чыгуначнай станцыі Багушоўка, з незавершаным дашчаным домікам, у прыгожым месцы, ў 70-ці метрах - рэчка Чарнуха. Тэл. 44-49-51.

Цагляны дом у г.п.Рось, ёсць прыродны газ. Тэл. у Ваўкавыску 4-34-75.

Катэдж у г.п.Мар'іна Горка (60 км ад Менска, агульная плошча - 140 кв.м, надзел - 25 сотак). Тэрмінова. Тэл. 44-43-09.

Пыласос айчыннай вытворчасці (магутнасць 800 Вт) у выдатным стане. Кошт - 17 у.а. Тэл. 6-45-74.

Кухню імпартную, халадзільнік «Ока-6», усё б/у; батарэю новую (10 рэбраў). Тэл. 31-24-73.

Камп'ютар 486 Dx4-100 / 24RAM/3,4HDD/512 video/ CD-ROM4x/14SVGA. Кошт - 220 у.а. Тэл. 44-03-24 (аб.573).

Трохпакаёвую кватэру ў г.п.Наваельня, недалёка - хваёвы бор, рака, санаторыі «Радон» і «Наваельня». Тэл. у Дзятлаўскім раёне 43-8-22 (пасля 15.00).

Канапу-ложак і два крэслы-ложкі. Тэл. 76-19-29.

4-мясцовую палатку. Тэл. 73-80-34.

Імпартную магнітолу б/у, новы аўтамабільны ўзмацняльнік, узмацняльнік «Вега-122» б/у, пральную машыну-аўтамат «Баўкнэхт» (вытворч. Германіі). Усё танна. А таксама новы фотаапарат «Зенит», зменныя аб'ектывы, фотапавелічальнікі, асвятляльнае ды іншае абсталяванне. Тэл. 73-00-00 (аб.95352).

Раздзяляльнік паралельных тэлефонных ліній з пераадрасоўкай гудкоў, без праслухоўвання на 2,3,8 абанентаў. Тэл. у Менску (017) 253-14-47.

Кнігі па эксплуатацыі і рамонту бытавой радыё-электраапаратуры; «Фантомас» 1-6 тамы, С.Жапрызо «Убийственное лето», Р.Хайнлайн «Звёздные рэйнджеры», «Космический патруль», А.Някрасаў «Приключение капитана Врунгеля», «Ужасы»; «Как стать бизнесменом», «Что и как делать, чтобы стать предпринимателем», «Живите без проблем: секрет лёгкой жизни», «Лекарственные средства». Калі вышлеце канверт са зваротным адрасам, то атрымаеце спіс кнігаў і кошты на іх. Лісты буду чакаць на адрас: 231600, Гарадзенская вобласць, г.Масты, вул. Пралетарская, 35/2.

Кнігі: энцыклапедыя «Беларуская ССР» у 5-ці тамах, 1982 г.; «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» ў 5-ці тамах, 1986 г.; энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі», 1982 г.; энцыклапедыя «Мир растений» у 7-мі тамах, 1977 г.; А.Брэм «Мир животных» у 3-х тамах, 1992 г.; «Живописная Россия», рэпрынтнае выданне, Менск, 1994 г.; «Советский энциклопедический словарь», Масква, 1984 г. Лісты дасылайце на адрас: 246024, г.Гомель, вул.Свярдлова, 56 (А.Копаць) ці тэлефануйце ў Гомель на нумар: 3-16-39.

Фотасветлафільтры, кружэлкі, трансфарматар 220х12В, люстру, кніжныя шафы, падпісныя выданні, карнізы. Усё б/у. Тэл. 33-59-87.

Перамычкі, пліты ПК. Тэл. 2-02-51 (працоўны; запрасіць Наталлю Васільеўну).

Электрапераключальнікі, фаеркі да электраплітаў, шклоізалятар. Тэл. 47-87-65.

Бульбу дробную і насенную. Танна. Тэл. 33-70-68.

## КУПЛЮ

Радыятар да BMW-525. Тэл. 31-30-62.

Каляску-двойку для двайнятаў. Тэл. 76-39-68.

Легкавы аўтамабіль (да 10 гадоў), пажадана дызель. Тэл. 31-30-62.

Каляровы манітор SVGA альбо VGA. Тэл. 73-00-00 (аб.95352).

Каталог «Панасонік 1998/1999» (тэле-відэа-аўдыётэхніка). Тэл. у Ваўкавыску 4-49-81, 4-49-05.

Камп'ютар Pentium-166 MMX, Ram-32, HDD-2,5 Gb і больш, SB, CD-ROM. Тэл. 44-94-22.

Дзіцячае харчаванне «Белакт-соя». Тэл. 47-35-26.

Дом ці надзел да 5000 у.а., прапаноўваць варыянты; дакументы на іншамарку. Тэл. 5-17-72 (пасля 18.00).

Факсімільнае выданьне Статуту ВКЛ 1588 году, граматыку Б.Тарашкевіча, кнігу «Летапісы і хронікі» зь серыі «Беларускі кнігазбор». Тэл. 5-36-02 (запрасіць Юлію).

Куплю наступныя выданні: 1) «Беларуская энцыклапедыя» т.1; 2) «Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі» т.1; 3) «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», т.4; 4) Энцыклапедычны даведнік «Беларусь». На абмен прапаную: 1) Міхась Ткачоў «Замкі і людзі»; 2) Кастусь Тарасаў «Памяць пра легенды»; 3) Генадзь Сагановіч «Невядомая вайна»; 4) кніжкі з серыі «Нашы славутыя землякі». Тэл. 47-24-00.

Антыкварыят, старыя манеты, узнагароды, гадзіннікі. Тэл. 72-02-26.

Кнігі на беларускай мове: мастацкую літаратуру (Л.Геніюш, Ул.Караткевіч, М.Гарэцкі, М.Багдановіч, А.Гарун, Цётка ды іншыя) і гістарычную літаратару (М.Ермаловіч, М.Ткачоў, Ул.Ігнатоўскі, В.Ластоўскі, Мітрафан Доўнар-Запольскі). Тэл. (017) 258-43-54.

Кнігі па ўтрыманню ў хатніх умовах пеўчых і дэкаратыўных птушак, акварыумных рыбак, а таксама кнігі па рыбнай лоўлі. Тэл. 76-47-19.

Складныя драбіны (пажарныя). Тэл. у Ваўкавыску 2-22-45 (пасля 20.00).

## ПАСЛУГІ

Рэпетытарства, кантрольныя і курсавыя работы па беларускай мове і літаратуры. Тэл. 6-67-55.

Рэпетытарства па фізіцы. Дапамагу ў рашэнні задачаў, кантрольных работаў. Тэл. 76-55-14 (запрасіць Юрыя).

Кантрольныя і курсавыя работы, энергазабеспячэнне, энергазберажэнне. Тэл. 5-92-07 (пасля 18.30, запрасіць Васіля).

Усё па гісторыі. Тэл. 47-35-26.

Абследаванне і лячэнне хранічных захворванняў па методыцы Р.Фоля. Ліц. МЗ РБ N224 да 30.XII.2001 года. Тэл. (8-017) 258-88-14.

Відэаздымка. Якасна выканаем работы па стварэнню відэафільма пра Ваш лёс, юбілей, прэзентацыі. Ліц. N613, выд. МК да 2004 г. Выязджаем на месца здымкі на сваім транспарце. Тэл. у Ваўкавыску 2-34-86.

Камп'ютарны набор, скананіраванне, раздрукоўка на лазерным прынтары. Тэл. 5-36-02 (запрасіць Юлію).

Доктар С.КАЛЯДА: інтэнсіўная псіхатэрапія АЛКАГАЛІЗМУ, ЗАЛІШНЯЙ ВАГІ. Найноўшыя методыкі. Тэл. 74-35-46 (да 18.00). Ліц. N796 па 2004 г., МЗ РБ.

Ангельская, балгарская мовы: пераклады, індывідуальнае навучанне. Тэл. 2-85-77.

Еўрарамонт, усе віды работаў, забеспячэнне, досвед працы ў нямецкай фірме. Тэл. 33-11-91.

Рамонт каляровых тэлевізараў. Установка ПАЛ, дыстанцыйнага кіравання, тэлетэксту. Ліц. N1243, выдадзеная МП да 2004 года. Тэл. 31-37-05.

Набор тэкстаў, табліцаў на камп'ютары. Раздрукоўка на струйным альбо матрычным прынтары. Танна. Не абавязкова на Вашай паперы. Тэл. 93-53-56.

Выраб сталяркі; усталяванне, зборка мэблі. Тэл. 47-87-65.

## МЯНЯЮ

Аднапакаёвую кватэру ў Менску (р-н «Серабранка») на кватэру ў Гродне. Тэл. 44-94-22.

## ЗДЫМУ

Аднапакаёвую кватэру ці адзін пакой. Тэл. 31-94-57 (запрасіць Тамару).

## РОЗНАЕ

Калі Вы валодаеце ангельскай мовай і маеце жаданне часова папрацаваць у прафсаюзе прадпрымальнікаў, тэлефануйце на пэйджар 73-00-00 абаненту 95200, а таксама дасылайце сваю аўтабіяграфію на адрас: 230005, Гродна-5, а/с 63.

Аргкамітэт Лігі Ліцьвінаў запрашае для сумеснай грамадзкай працы асобаў, зацікаўленых ў станаўленьні заходнебеларускага (ліцьвінскага) рэгіянальнага этнакультурнага руху. Тэл. (8-017) 214-20-39, пэйджар (8-017) 207-00-00 (аб.6663).

Шукаю працу па падшыўцы і падклейванню падэшваў у абутку. Тэл. 31-77-41 (у любы зручны для вас час).

Шукаю працу па нарэзцы пратэктару шынаў легкавых, грузавых машынаў усіх марак. Тэл. 44-39-15.

Шукаю працу на даму. Сартаванне, упакоўка. Інтым не прапаноўваць. Тэл. 76-39-71.

Здаю напракат: прыстаўку «Нота», фотаапарат, прас, кнігі. Звяртацца на адрас: 230001, г.Гродна, да запатрабавання, в/б БЕ 008703.

Патрабуецца сталяр. Тэл. 47-87-65.

Шукаю працу па абіўцы мяккай мэблі. Забяру непатрэбную старую мэблю. Тэл. 44-39-15.

Калі Вы, таксама як і я, любіце бодзібілдынг, але, мо не маеце мажлівасці ім займацца, тэлефануйце - пазнаёмімся! Тэл. 6-62-09 (запрасіць Сергея).

Маю цікавую інфармацыю пра зорак эстрады; неблагія постэры Сцінга, Э.Прэслі ды іншых. Замаўляйце і дасылайце канверт са зваротным адрасам. Мой адрас: 225889, Кобрынскі раён, в.Астромічы, да запатрабавання, прад'яўніку дакумента серыі АВ N0420164.

Ахвотныя атрымаць новы нумар газеты «Беларускі калекцыянер» N1(20), дашліце замову, свой дакладны адрас і 80 рублёў. У Менску газету заўжды можна набыць у сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, што па вуліцы Румянцава,13. Лісты дасылайце на адрас: 211030, г.Орша-9, п/с 46.

Згубленае пасведчанне за нумарам 417 прадпрымальніка Валерыя Фёдаравіча Рэкеця лічыць несапраўдным.

Выстава аўдыё-відэа-кнігапрадукцыі працуе па новым адрасе: г.Гродна, вул. К.Маркса, 11, 2-і паверх. Чакаем вас кожны панядзелак і сераду з 17 да 20 гадзін.

Супрацоўнікі рэдакцыі ПАГОНІ вельмі ўдзячныя тым чытачам, хто напрыканцы аб'яваў ў рубрыку «Знаёмствы» ўказвае нумар паштовага аддзялення сувязі і сваёй абаненцкай скрыні альбо наступную інфармацыю: індэкс паштовага аддзялення, «да запатрабавання, прад'яўніку пашпарта ці іншага дакумента...». Гэта дае ўсе падставы меркаваць, што абвесткі наконт знаёмстваў належаць менавіта вам, шаноўныя чытачы, а не тым, хто жадае з вас пажартаваць.

## ЗНАЁМСТВЫ

Жадаю знайсці для стварэння сям'і прыстойную жанчыну, якая мае жылплошчу. Пра сябе: мне 33 гады, рост - 165 см; жанаты не быў, па нацыянальнасці - беларус, па знаку Задыяка - Скарпіён. Чакаю лісты на адрас: 230025, г.Гродна, Галоўпаштамт, да запатрабавання, п/п IV-ДР N706368.

20-гадовы хлопец жадае пазнаёміцца з 18-20-гадовай дзяўчынай для сустрэчаў. Пра сябе: 175/70, чарнявы. Адкажу ўсім. Пажадана фота. Пісаць на адрас: Гарадзенская вобласць, Гарадзенскі раён, п/а Жыдомля, в.Абухавічы, п/с 36.

## ВІНШАВАННІ

Шчыра віншуем *Лілію Сіманаву* з Днём нараджэння! Жадаем табе, мілая Лілія, самага галоўнага: здароўя, бо яго не купіш ні за якія грошы; шчасця - яго так цяжка знайсці; кахання вялікага і зямнога - у любым узросце яно цудоўнае і, канешне, светлай надзеі на лепшае! Заставайся заўсёды такой, якой мы цябе ведаем - маладой, прыгожай, энергічнай, добрай і абаяльнай!

**Твае сябры**

---

**Рэдакцыя газеты ПАГОНЯ абвяшчае КОНКУРС на замяшчэнне пасады кіраўніка аддзела рэкламы і маркетынгу.**

**Абавязковыя ўмовы:** амбітнасць, камунікабельнасць, досвед працы.

Даведкі па тэлефонах: 72-29-96, 72-37-14.

---

**ПАГОНЯ купон прыватнай бясплатнай аб'явы**

14 Імя і прозвішча ____________________

Адрас (тэлефон) ____________________

Рубрыка ____________________

Тэкст ____________________

Аб'явы, дасланыя на купонах, друкуюцца ў першую чаргу; неразборліва напісаныя аб'явы не друкуюцца

Купон з тэкстам адпраўце па пошце на адрас: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11

---

**Моладзевы Антыфашыстоўскі Цэнтр абвяшчае конкурс на лепшы антыфашыстоўскі малюнак «Беларусь без свастыкі». Малюнкі прымаюцца ў любым выглядзе і любога фармату. Свае творы дасылайце на адрас: 230003, г.Гродна-3, а/с 62, МАЦ альбо прыносьце кожны чацвер і нядзелю ў 19.30 на вуліцу К.Маркса,11 (першы паверх). Пераможцаў чакаюць каштоўныя прызы!**

---

# Гарадзенскі ўікэнд



**Гісторыка-археалагічны музей. Стары замак.** Выстава «Гродна, адкрыты археолагамі». **Новы замак.** Авальная зала. Выстава з музея гісторыі рэлігіі - «Біблія - кніга кніг». Сенатарская зала. З 27 красавіка - выстава жывапісу гарадзенскага мастака Юрыя Радзько. Дзейнічае экспазіцыя «Зброя мінулых стагоддзяў».

**Галерэя «У Майстра» (вул. Кірава, 14).** «Гарадзенскі сейм» - зборная выстава дзесяці мастакоў. Жывапіс і скураное пано.

**Выставачная зала Саюза мастакоў** - выстава «Міні прынт». Графіка, афорты. Арганізатар выставы - Юрый Якавенка.

**Галерэя «Тызенгаўз».** Дзейнічае выстава майстраў народнай творчасці «Вера, Надзея, Любоў».

**Музей Гісторыі Гарадніцы (вул. Ажэшкі, 37).** Выстава вышыванак Марыі Закрэўскай.

**Галерэя «Раскоша» (вул. Ажэшкі, 39а).** Выстава антыкварыяту і твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Музей Максіма Багдановіча** запрашае з 10.00 да 18.00. Дзейнічае выстава, прысвечаная Францішку Багушэвічу. Выхадныя дні: нядзеля, панядзелак.

**Тэатр лялек.** 30 красавіка - «Снежная каралева». Пачатак спектакля ў 12.00.

**Гарадскі Дом культуры.** 27 красавіка - Велікодная дзіцячая тэатральная праграма. Пачатак у 13.00. 4 траўня - вечар польскай культуры. Пачатак ў 19.00.

**Дом афіцэраў.** 29 красавіка - моладзевы тэатр гумару «Канкан» прадстаўляе праграму «Гуляючы па Кракаву, закрываемся». Пачатак у 19.00. 2 траўня ў 19.00 - «Агні старога цырка» з удзелам маленькіх артыстаў.

**Лядовы палац спорту.** 27,28 красавіка - фестываль-кірмаш «Без межаў».

**Палац культуры хімікаў.** 1 траўня ў 15.00 і 17.00 - «Агні старога цырка» з удзелам маленькіх артыстаў.

**Сярэдняя школа N25.** 4 траўня - вечар франтавых сяброў. Пачатак у 13.00.

## Моладзевыя дыскатэкі

**Палац «Юнацтва»** - з 20.00 да 01.00.

**Палац тэкстыльшчыкаў** - з 20.00 да 24.00 (у пятніцу), з 20.00 да 01.00 (у суботу), з 20.00 да 01.00 (у нядзелю).

**Кінатэатр «Усход»** - з 22.00 да 24.00 (у пятніцу), з 22.00 да 01.00 (у суботу), з 22.00 да 24.00 (у нядзелю). Штодня працуе пракат відэакасетаў, більярд, камп'ютарныя гульні.

**Кінатэатр імя Пушкіна** - з 22.00 да 24.00 (у пятніцу), з 22.00 да 01.00 (у суботу), з 22.00 да 24.00 (у нядзелю).

**Кінатэатр «Кастрычнік»** - з 22.00 да 01.00 (акрамя панядзелка і аўторка). Працуе кафэ-бар (серада - нядзеля).

**Калізей-2000.** Начны клуб адчынены з 23.00 да 05.00, акрамя панядзелка - танцавальныя і стрыпціз-шоу. Рэстаран працуе з 12.00 да 05.00.

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



ПЯРЭСТЫ КУТ

# Гарадзенскі арт-сейм: веснавая эйфарыя

**У мінулую сераду ў галерэі «У майстра» была адчынена выстава «Гарадзенскі сейм». Удзел у ёй узялі 10 мастакоў, якія толькі што вярнуліся з аднайменнага пленэру па Беларусі. Аматары мастацтва цяпер маюць рэдкую магчымасць бачыць самыя новыя і цікавыя творы лепшай гарадзенскай мастацкай дзясяткі.**

На выставе - творы самых розных жанраў і стыляў: інсталяцыя А.Зельберга, пейзажы В.Рамашкі, В.Малочкі. Вельмі ўражвае Р.Майсей з «Вандроўкай па парку» - адначасовае сутыкненне агністых чырвоных тонаў і прымітывісцкага малюнка прымушае западозрыць, што мастак гуляў не па парку, а па першабытных пампасах, населеных дзікімі плямёнамі.

В.Стратовіч выбраў зусім нечаканы ход - вырашыў паказаць не разнастайныя пленэрскія пейзажы, а адразу ўжо «Стварэнне сусвету». У двух сваіх новых карцінах ён трактуе светабудову з пазіцыяў, блізкіх да тантрычнага вучэння Усходу, дзе абагаўляецца эратычная блізкасць, а каханню прыпісваецца жыццястваральная сіла.

Пра кожнага ўдзельніка гэтай выдатнай выставы можна напісаць цэлы трактат, але з імі мы яшчэ сустрэнемся на старонках газеты пазней. А цяпер звернемся да кіраўніка і арганізатара мастацкай акцыі Алеся Сурава.

***- Алесь, назва пленэра «Гарадзенскі арт-сейм» нясе напамін пра сеймы часоў караля Стэфана Баторыя. Тут ёсць нейкая рэальная сувязь?***

- Мы назвалі так пленэр у гонар апошняга сейму Рэчы Паспалітай, што адбыўся ў Гродне. Гэта настальгія па тых часах, калі наша культуральная прастора пралягала «Ад Берліна да Масквы і ад Балтыкі да Каспія». Сёння, на жаль, ужо ўсе прызвычаіліся думаць, што Беларусь - гэта краіна мужыкоў у лапцях і галасячых баб. Трэба аднаўляць ідэю прыналежнасці да еўрапейскай культурніцкай прасторы.

***- Аднак у сейме павінны былі б узяць удзел і нашы бліжэйшыя суседзі - палякі, літоўцы...***

- Я запрашаў мастакоў з Польшчы, Літвы, але яны, гледзячы на нашыя разгоны дэманстрантаў, арышты і знікненні людзей, проста пабаяліся ехаць. І таму «першы блін» выйшаў камяком - атрымаўся такі невялікі акруговы сеймік. Я правёз мастакоў па знакавых гарадах Беларусі - Наваградку, Міры, Нясвіжы. Я лічу, што такія тусоўкі нам патрэбныя.

***- Ты наогул вылучаешся сваёй здольнасцю ўляпвацца ў розныя гісторыі. Як табе прыйшло ў галаву яшчэ і мастацкі сейм арганізаваць?***

- А яшчэ мінулым летам, пад піва. Хацеў спалучыць розных мастакоў, розныя погляды ў адну тусоўку. Падчас нашага пленэру была атмасфера вольнай творчасці - гэта галоўнае. У нас жа мастацкае асяроддзе пабітае на групоўкі, мастакі працуюць самі па сабе. Я хацеў іх скантактаваць.

***- Гледзячы на вашу выставу, можна, напэўна, сказаць: «Ёсць кантакт!»***

- Зрэшты, я не ставіў задачы - зрабіць за гэты тыдзень, на працягу якога доўжыўся пленэр, выставу. Трэба працаваць не па заказу, а вольна выяўляць сябе. Ставілася пытанне - сама праца, сумесныя паездкі, гэткая творчая тусоўка.

***- Прызнайся шчыра, табе асабіста навошта гэта патрэбна? Ты ж і так у нас «нячэсны» мастак, а тут яшчэ сейм...***

- Калі ёсць энергія - то чаму б і не зрабіць нешта, што сапраўды мяне цікавіць? У нас адзінае, што засталося на еўрапейскім узроўні - гэта мастацтва і жанчыны. На гэта не можа ўплываць ідэалогія. Думкі мастака не залежаць ад знешніх умоваў.

***- Аднак ты сам актыўна ўвязваешся ў палітыку.***

- Мастацтва заўсёды стаіць над палітыкай. Я ўжо ўвязаўся ў жыццё, а там скрозь - палітыка. Урэшце, хто выдумаў, што нармальны мужык не павінен займацца палітыкай? Кожная паважаючая сябе асоба павінна выказаць сваё стаўленне да падзеяў. Акрамя таго, я як мастак, не люблю жлобства, бескультур'я. «Гарадзенскі сейм» найменей звязаны з палітыкай, але - з гісторыяй, культурай. Гэта - альтэрнатыва афіцыёзу ад культуры.

***- «Гарадзенскі арт-сейм» будзе мець працяг на будучы год?***

- Сто працэнтаў, што я буду рыхтаваць наступны пленэр. Гэтым разам я рабіў адзін, без каманды. Буду ўсталёўваць уласная кантакты з канкрэтнымі людзьмі з замежжа. Але па тым настроі радасці, нават эйфарыі, я бачу, што раблю правільна. І упэўнены, што наш сейм атрымаўся.

Гутарыла
Алена Сіневіч



Удзельнікі гарадзенскага арт-сейму на Свіцязі



**Па гарызанталі:** 7.Скрыначка для дробных рэчаў. 8.Рэакцыянер, вораг прагрэсу. 10.Што такое сауна? 11.Краіна, якой была да рэвалюцыі Расея. 12.Ён сядзіць насупраць. 14.Ён не патрэбны, каб адкрываць шампанскае. 16.Беларускі драматург, аўтар п'есы «Папараць-кветка». 17.Ён баіцца ладану. 19.Сярэбраная манета Вялікага княства Літоўскага. 20.Кіраўнік царкоўнай вобласці. 24.Лёгкі гумар. 25.Беларускі класік, які апісаў жыццё людзей на балоце. 26.Хакаская сталіца. 30.Малады чалавек несур'ёзных паводзінаў. 31.Згода прыняць дыплamata. 32.Адзін з тых, чыя сталіца Петразаводск. 33. 6 жніўня 1945 года ЗША скінулі на гэты горад першую атамную бомбу. 34.Перавучаны салдат, недавучаны сяржант.

**Па вертыкалі:** 1.Геадэзічны інструмент. 2.Ірыс, які смокчуць. 3.Велічыня, якая характарызуецца толькі лічбавым значэннем. 4.Верхняя частка галавы. 5.Працэс разбурэння горных парод водным патокам. 6.Род загадкі-галаваломкі. 9.Іначай - пярэплат. 13.Палоска тканіны, якая нашываецца зверху на сукенку. 15.Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Польшчы. 17.Галоваў шмат, а хвост адзін. 18.Галоўнае, што павінна быць паміж партнёрамі. 21.Навука пра жывёл. 22.Нацыя ў Еўропе. 23.Абласны цэнтр Узбекістана. 27.Прыбор для падтрымання пастаянства сілы электрычнага току. 28.Раённы цэнтр у Магілёўскай вобласці. 29.Фасон штаноў. 32.Казачны эпітэт лісы.

**Адказы на крыжаванку, змешчаную ў N13:**

**Па гарызанталі:** 7.Ісландцы. 8.Дэкальтэ. 10.Пекла. 11.Сталіца. 12.Кельня. 14.Акацыя. 16.Келіх. 17.Хмыз. 19.Храпка. 20.Істота. 24.Юрта. 25.Лойка. 26.Жандар. 30.Страва. 31.Абразія. 32.Выкуп. 33.Фісташка. 34.Лішайнік.

**Па вертыкалі:** 1.Есентукі. 2.Зносіны. 3.Сцяпан. 4.Тэма. 5.Чацвер. 6.Ютландыя. 9.Экасез. 13.Гірса. 15.Цурка. 17.Хітон. 18.Шклоў. 21.Трутавік. 22.Тканка. 23.Рамізнік. 27.Агрэсар. 28.Ювенал. 29.Паплін. 32.Віка.

# Гараскоп

♈ **Баран (21.03-20.04).** На гэтым тыдні не чакайце ад сваякоў асаблівай увагі. Не трэба ўскладаць на сябе адказнасць за некага іншага.

♉ **Бык (21.04-20.05).** Нягледзячы на некаторыя складанасці на працы і ў хаце, у Вас з'явіцца магчымасць выйсці на новы жыццёвы ўзровень.

♊ **Блізняты (21.05-21.06).** Выхадныя ўзрадуюць Вас прыемнымі нечаканасцямі. Цяснейшымі стануць адносіны з новымі знаёмымі.

♋ **Рак (22.06-22.07).** Не чакайце ніякіх зменаў на працы. У асабістым жыцці - усё надзвычай стабільна.

♌ **Леў (23.07-23.08).** Не трэба здзіўляцца, нават калі Вам прапануюць паехаць у Амерыку. Аднак перш чым рызыкаваць - падумайце, ці сапраўды варта.

♍ **Панна (24.08-23.09).** Адкладзіце хаця б палову Вашых справаў на наступны тыдзень. Лепей добра адпачніце дзесьці з каханай(-ым). Такое цудоўнае надвор'е! Карыстайцеся шанцам!

♎ **Шалі (24.09-23.10).** На гэтым тыдні ўзнікнуць нечаканыя турботы ў сувязі з тым, што Вашым сваякам спатрэбіцца матэрыяльная падтрымка. І наогул, настройцеся на даволі актыўны тыдзень.

♏ **Скарпіён (24.10-22.11).** Выхадныя небяспечныя перш за ўсё фінансавымі растратамі. Будзьце асцярожней з малазнаёмымі людзьмі.

♐ **Стралец (23.11-21.12).** Днямі Вас чакае прыемная сустрэча са знаёмымі. Зоркі раяць Вам наладзіць добрыя адносіны з начальствам.

♑ **Казярог (22.12-20.01).** На працы чакайце зменаў, а вось у асабістым жыцці - непрыемнасцяў, калі Вы, канешне, не ў камандзіроўцы.

♒ **Вадалей (21.01-19.02).** Гэты тыдзень патрабуе ад Вас асцярожнасці і ўважлівасці.

♓ **Рыбы (20.02-20.03).** Не асабліва разлічвайце на інтуіцыю, больш давярайце сябрам і сваякам. Іначай прымаць рашэнне Вам будзе надзвычай цяжка.

# «Вера, Надзея, Любоў» - добры фінал і пачатак

**Напярэдадні каталіцкага Вялікадня ў галерэі «Тызенгаўз» адчынілася выстава майстроў народнай творчасці. Яна прысвечаная 2000-годдзю хрысціянства і мае назву «Вера, Надзея, Любоў».**

На вернісажы метадыст гарадскога аддзелу культуры і арганізатар выставы Яна Барысевіч заўважыла, што «гарадзенскае Таварыства народных майстроў упершыню ладзіць выставу ў гэтых гістарычных мурах». Удзел у выставе ўзялі 23 самадзейныя майстры. Яны прадставілі вялікую разнастайнасць дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і жывапісу. Дзмітрый Іваноўскі паказаў свае вялікія палотны з выявамі на рэлігійныя тэмы. Асноўную частку экспазіцыі займаюць вышываныя і маляваныя абразы, выявы культавай архітэктуры, саламяныя пано, драўляная скульптура.

Дырэктар залы Аляксандр Ларыёнаў, аматар трапнага слоўца, як заўсёды віртуозна зазначыў да тэмы: «За недасканаласцю мазка і недакладнасцю малюнка самадзейнага мастака не трэба бачыць лепет немаўляці - але шчырасць і адкрытасць, блізкую да Бога».

Пасля 3,5-гадовай выставачнай дзейнасці галерэя «Тызенгаўз» мяняе ўладальніка і, напэўна, змест работы. Хутчэй за ўсё, выстава народных майстроў «Вера, Надзея, Любоў» - апошняя з шэрагу выставаў, што мы бачылі да гэтай пары.

Пра новае жыццё «Тызенгаўза» чытайце ў наступным нумары ПАГОНІ.

Алена Сіневіч

# Беластоцкія вучні сталі студэнтамі Гарадзенскага універсітэта

**Як паведаміла беластоцкая газета «Ніва», 23 сакавіка ў Беластоку адбыўся штогадовы набор студэнтаў у беларускія ВНУ. Сёлета праэкзаменавана 29 вучняў, 27 чалавек прынята ў навучальныя ўстановы Беларусі.**

У Гарадзенскі універсітэт прынята трынаццаць чалавек на факультэты нямецкай і ангельскай моваў, міжнародных эканамічных адносінаў, псіхалогіі і фізічнай культуры.

Ці будзе гэтая моладзь адчуваць сябе сярод сваіх?

Ул.інф.

ПАГОНЯ
Заснавальнік: культурна-асветніцкі фонд "Бацькаўшчына"

Адрас рэдакцыі:
230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11.
Тэл.72-37-14, 72-35-61, факс 72-29-96.
E-mail: pagonia@irex.minsk.by
Падпісны індэкс: 63124.

Рэгістрацыйны нумар 597. Нумар газеты надрукаваны ў Гарадзенскай абласной узбуйненай друкарні.
Адрас: 230023, г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4.
Замова 1 420 Наклад 8 001
Нумар падпісаны да друку ў 16.00 26.04.2000 г.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі. Якасць друку адпавядае прадстаўленым рэдакцыяй дыяпазітывам.

Галоўны рэдактар Мікола Маркевіч

Камп'ютарны набор: Аксана Бурдзюк, камп'ютарная вёрстка: Аляксей Салей

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013